З песнямі Арлянскай гміны ☞ 4

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Пятро Ластаўка ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 7 (2649) Год LII | Беласток, 18 лютага 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Адкрыццё Музея распачалося ў Благавешчанскай царкве. Выступіў кафедальны хор „Аксіён” з сабора св. Мікалая ды мужчынскі хор Супрасльскага манастыра. Асабіста ў дзвярах храма вітаў гасцей архімандрыт Гаўрыіл...

СУПРАСЛЬ, МІСТЫЧНЫ ТЭАТР

— Гэта імпазантнае! — такія выказванні можна было пачуць сярод тлуму ў пару соцень асоб, які прыбыў у суботу 10 лютага на канчатковае адкрыццё Музея ікон у Супраслі — філіяла беластоцкага Падляшскага музея. Дырэктар Падляшскага музея Анджэй Ляхоўскі адкрываў супрасльскі асяродак ужо другі раз. Аб першым адкрыцці пры ўдзеле першаіерархаў Праваслаўнай царквы і Каталіцкага касцёла ды прадстаўнікоў мясцовых улад мы пісалі ў 42 н-ры за 2006 год. У гэты раз захапляцца экспазіцыяй можна было ва ўсёй яе пышнасці, хоць афіцыйных свецкіх саноўнікаў не хапіла, ну, можа, па-за віцэ-прэзідэнтам Беластока Аляксандрам Сасной ці дэпутатам Яўгенам Чыквіным. Захапленню некалькімі сотнямі аб’ектаў (ікон, праваслаўных крыжоў, м.інш. падарожных іконак XVIII-XIX стагоддзяў і шаснаццацівечных фрэскаў) спадарожнічалі гукавыя эфекты: галасы птушак, ціхі гоман малітваў, царкоўныя спевы. Своеасаблівым акцёрам з’яўляецца ігра цьмянага святла і святлістых колераў, як хоць бы ў адной з залаў, калі святло пад уплывам фотаэлемента перамяшчаецца разам з наведвальнікамі. Запраектаваў і мастацка выканаў гэты мультымедыйны свет ды паставіў гэтую своеасаблівую гульню гукаў і святла Лех Навацкі. У шмат якіх месцах можна прачытаць дакладнае апісанне, звязанае з сутнасцю паасобных экспанатаў. Адной з аўтарак тэкстаў з’яўляецца загадчыца музея ікон Крыстына Мазурук.

На трох узроўнях гледачы праходзяць праз залы ахутаныя ў звіслыя палотны, малюнкі, прыгадваючыя катакомбы, агромныя здымкі, якія, для прыкладу, паказваюць хрэсны ход з мошчамі святога Гаўрыіла. Фактычна, у імпазантны спосаб паказана атмасфера звязаная з пачаткамі хрысціянства, іконамі, якія спасылаюцца на літургічны каляндар (завешаныя на падчэпленым да столі коле), творчасцю старавераў, святам Іардана, Грабаркай і г.д. Атмасфера таксама захавана ў калідорах паміж паасобнымі заламі. Убачыць там можна м.інш. першую ікону, якую перадала музею сорак гадоў таму Тэкля Бэрэжнюк са Шчытоў-Дзенцялова і сямейныя іконы, падараваныя вядомым фатографам Віктарам Волкавым. З гледачамі развітваюцца фрэскі паўтысячагадовай даўнасці, уратаваныя са зруйнаванай у 1944 годзе супрасльскай царквы.

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Злева: дырэктар Падляшскага музея Анджэй Ляхоўскі, епіскап Беластоцка-Гданьскі Іакаў і новарукапаложаны Сямятыцкі епіскап Георгій

Адкрыццё Музея распачалося ў Благавешчанскай царкве. Выступіў кафедальны хор „Аксіён” з сабора св. Мікалая ды мужчынскі хор Супрасльскага манастыра. Асабіста ў дзвярах храма вітаў гасцей архімандрыт Гаўрыіл. Епіскап Беластоцка-Гданьскай епархіі Іакаў тлумачыў сабраным:

— Ікона як святы абраз з’яўляецца таксама акном у іншы свет, спалучае абодва светы. Калі молімся да святых, маем лучнасць з іншасветам. Шляхам малітвы ўваходзім у вечнасць.

Прывітанні ад мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы пераказаў новарукапаложаны Сямятыцкі епіскап Георгій. Пасля выставы пад загалоўкам „Ікона: вобраз і слова — паміж тым што імгненнае і вечнае”, епіскап Іакаў у размове з „Нівай” сказаў:

— Сёння цяжка падзяліцца сваімі ўражаннямі, бо было тут столькі людзей, што гэта ўсё не падзейнічала так, як мела падзейнічаць. Тым не менш, сапраўды, робіць гэта імпазантнае ўражанне. Неўзабаве маю намер сюды прыехаць і паглядзець на ўсё спакойна.

— Ці не будзе гэта для іконы, гэтага акна ў іншасвет, як Ваша Праасвяшчэнства назвалі, якая экспануецца на такой выстаўцы, у музеі, у свецкім месцы, куды пускаюць за білетамі, прафанацыя яе істоты? — дапытваліся мы.

— Ікона гэта прадмет малітвы. Невыпадкова ікона не ёсць рэалістычнай карцінай — напрыклад, перспектыва тут адваротная, прапорцыя постаці не захоўваецца рэалістычна. Адпаведным месцам для іконы з’яўляецца храм ці малітоўны куточак у хаце. Я маю, аднак, надзею, што гэтая атмасфера, якую тут стварылі, гэтае ўсё афармленне, той нейкі прысмак духоўнасці, можа, дапаможа камусьці спазнаць ікону глыбей і можа для гэтай асобы стане яна гэтым акном у вечнасць.

Вядомы і прызнаны амаль ва ўсім свеце падляшскі мастак, праф. Анджэй Струміла ў сваю чаргу падзяліўся з намі сваімі ўражаннямі:

— У гэтай экспазіцыі містычна-тэатральны характар. Гэта адмысловы паратэатр. Гэта вельмі добрае месца для кагосьці, хто хацеў бы перажыць першы кантакт з мастацтвам праваслаўя. Мне, старому прайдзісвету, які хацеў бы ўвайсці глыбей у архітэктуру іконы, у яе структуру і сімволіку, больш адпавядала б спакайнейшая экспазіцыя, дзе было б роўнае святло і не паганяў бы мяне рытм запланаванага турысцкага паходу.

І дадаў:

— Я думаю, што выстава будзе схіляць людзей да рэфлексіі, да пошукаў у жыцці чагосьці глыбейшага, па-за адной жарснай прыемнасцю.

Уважлівае наведанне экспазіцыі займае каля дзвюх гадзін. Без ніякіх сумненняў, супрасльскі Музей ікон з’яўляецца адзіным свайго роду ў Польшчы (другі, менш турыстычна прыцягальны, ёсць у Саноку), а пэўна і ў Еўропе. Адкрыты ён штодзённа (апрача панядзелкаў) ад 10 да 17 гадзіны. Летам паміж 12 і 19. Білеты ў цэнах 10 зл. і 5 зл. (ільготны, сямейны).

Раіна СТЭФАНЧУК

Эх, размовы, перамовы... ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

З начальнікам беларускай дзяржавы зноў загаварылі. Ды не абы хто?! У параўнанні з новымі суразмоўцамі з Захаду, расійскія Генадзій Зюганаў і Аляксандр Праханаў, якія імгненна прыляцелі ў Мінск, каб падтрымаць пазіцыю беларускага ўрада ў канфлікце з Расіяй, гэта дробязь не вартая ўвагі. Гэтыя і раней наведваліся...

Фестываль беларускай песні ☞ 3

Міра ЛУКША

Незалежна ад адсутнасці міністэрскай дапамогі МУСіА фестываль беларускай песні мусіў адбыцца. Без раённых элімінацый, адразу цэнтральны. Арганізавала яго Таварыства беларускай культуры разам з Беларускім грамадска-культурным таварыствам (адрас такі самы — Беласток, вул. Варшаўская, 11)...

Гацькоўскія танцы ☞ 5

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

У Гацьках адбываецца змаганне за зямлю. За зямлю, якую „народная ўлада” адабрала мясцовым земляробам у перыяд калектывізацыі, а цяперашняя ўлада, свая, „тутэйшая”, не хоча яе вярнуць мясцовым нашчадкам былых уласнікаў. Сённяшняя войт Раіса Раецкая ў пісьме таварыству „Гай” спасылаецца на тое, што цяпер тая зямля з’яўляецца ўласнасцю казны і распараджаецца гэтай зямлёй сувальская філія ольштынскага аддзела...

Яшчэ пра маладых... ☞ 8

Ілона КАРПЮК

Інтэрв’ю з Аліцыяй СЕГЕНЬ-МАТЫЕВІЧ навуковым супрацоўнікам Вармінска-Мазурскага універсітэта, аўтаркай кніжкі і заадно сваёй дысертацыі „Пачуццё нацыянальнай тоеснасці моладзі беларускага паходжання, насяляючай усходняе памежжа Польшчы. Перспектыва міжкультурнай адукацыі”...

Эх, размовы, перамовы...

З начальнікам беларускай дзяржавы зноў загаварылі. Ды не абы хто?! У параўнанні з новымі суразмоўцамі з Захаду, расійскія Генадзій Зюганаў і Аляксандр Праханаў, якія імгненна прыляцелі ў Мінск, каб падтрымаць пазіцыю беларускага ўрада ў канфлікце з Расіяй, гэта дробязь не вартая ўвагі. Гэтыя і раней наведваліся. Куды ім яшчэ ездзіць з бязглуздымі ідэямі аб'яднання пралетарыяў дзвюх краін або сялян адной імперыі. А вось візіт Рэнэ ван дэр Ліндэна — старшыні Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы сапраўды стаў для Беларусі гэткім еўрасюрпрызікам. Прычым для ўсіх: і для ўлады, і для апазіцыі. Улада не спадзявалася хіба, што Еўрасаюз яе яшчэ можа разглядаць як суб'ект для перамоў. Ну, а апазіцыя якраз чакала таго, што Еўропа будзе спрыяць, каб улада села за стол перамоваў менавіта з апазіцыяй. А так яна нібыта стала ўвогуле лішняй, паміж прагматычным Захадам і транзітам расійскай нафты.

Ну, а пасля такой увагі нашай краіне з боку еўрапейскага максі-палітыка ўсё пайшло само па сабе. Замежныя вядомыя тэлеагенцтвы і невядомыя журналісты ў імгненне вока засыпалі ўсю еўрапейскую прэсу тым шматслоўем, якое беларусы змушаны слухаць ужо дванаццаць гадоў. Вось табе і на! Гэта вам не ўлюбёныя і перыядычна ладжаныя прэсавыя канферэнцыі для расійскіх журналістаў, што прыязджаюць з такой глухой правінцыі, дзе чытачы выкарыстоўваюць газеты выключна ў якасці туалетнай паперы.

На гэты раз скалыхнулася еўрапейская прэса, што грунтуецца на свабодзе слова і друку, праўдзівасці інфармацыі, і якая, да затрымкі паставак расійскага газу ў Еўропу праз Беларусь, тлумачыла, што з прадстаўнікамі беларускага ўрада размаўляць не трэба. А цяпер, выяўляецца, што трэба. А што змянілася? У тым і справа, што па вялікім рахунку — нічога. Ні беларуская палітычная сістэма, ні прагматызм еўрапейскіх палітыкаў.

Але найбольшы рэзананс выклікаў адкрыты ліст да першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад нядаўняга кандыдата на гэтую пасаду Аляксандра Мілінкевіча, які таксама наважыўся загаварыць са сваім цёзкам. Другі экс-прэтэндэнт на галоўнае крэсла краіны Аляксандар Казулін, што зараз за кратамі, рэзка раскрытыкаваў гэты зварот і назваў яго праявай як палітычнай, так і чалавечай слабасці, якая дае яшчэ адзін козыр у рукі беларускага правіцеля. Хоць пазней, пасля наведвання нямецкім амбасадарам у турме лідэра БСДПГ, адзін з намеснікаў Казуліна, заявіў пра гатовасць іх партыі да перамоваў з уладамі. Дзе логіка? Тут, як гаворыцца, сам чорт нагу зломіць.

Як не ўчытвайся ў той адкрыты ліст, нічога кепскага там няма. І нічога новага. Чарговы паўтор прапаноў Еўропы, на якія напачатку сам Мілінкевіч адрэагаваў адмоўна. І каб ён зрабіў наадварот, спачатку напісаў свой адкрыты ліст, а пасля, як беларускі ўрад не выканае ўмоваў Еўрасаюза (у чым няма ніякіх сумненняў), растлумачыў наіўным еўрапейцам пра сутнасць існай на Беларусі ўлады, то ўсё выглядала б лагічна. А то ўзнікае думка, што еўрапейскія палітыкі толькі і могуць пераконваць прадстаўнікоў беларускай апазіцыі. А афіцыйны Мінск цвёрда давёў да Еўропы, што трэба супрацоўнічаць з такой уладай, якая ёсць. Другой не будзе. І ніякіх умоваў, бо зараз Беларусь гатова стаць самым лепшым на свеце эканамічным партнёрам цывілізаванага свету, нават правесці акцыянаванне і прыняць замежныя інвестыцыі, ды толькі ў палітычны лад ніхто не мае права сунуць носа. Такі своеасаблівы беларускі варыянт еўрапейскага Кітая.

І ніхто так і не зразумеў чаму, пры ўсіх намаганнях, сур'ёзная размова з абмеркаваннем саступак і ўзгадненнем пазіцый так і не атрымалася. І не атрымаецца, бо няма прадмету размовы. Няма пра што гаварыць. Рэнэ ван дэр Ліндэну адразу гэта даходліва „давялі" заявіўшы, што палітвязняў у Беларусі няма. Якія ж умовы па іх вызваленні можна ставіць?

А тут і яшчэ адзін суседні прэзідэнт зноў наважыўся паразмаўляць з беларускім кіраўніком. Той, хоць з-за незгаворлівага Мінска і не стаў пакуль што першым шэфам аб'яднанай беларуска-расійскай дзяржавы, але не губляе такой надзеі. Гэта В. В. Пуцін. Вось з ім размова атрымаецца, бо ёсць пра што гаварыць. І зусім непрымальных умоў Пуцін не ставіць. Ні палітвязняў на Беларусі не шукае, ні дэмакратычных рэформаў не патрабуе. І хоць абодва бакі будуць стараццa абдурыць адзін аднаго, кожны на сваю карысць, у іх усё ж больш агульнага паміж сабой, чым рознага. Як сцвярджае старая прымаўка — груган гругану вока не выдзеўбе. А газ, нафта, транзіт, ваенныя аб'екты, ды яшчэ безліч розных спрэчных пытанняў — гэта толькі аргументы на карысць аднаго ці другога боку.

Віктар САЗОНАЎ

Расія і мы

Адразу скажу, што мы — гэта тутэйшыя нашы беларусы.

У тэксце „Нафта-газавая каніцель" („Ніва" № 5 ад 4.02.2007 г.) я намякнуў на тое, што сучаснай Расіі далекавата яшчэ да поўнай нармальнасці. Сёння дадам, што і царскай Расіі не хапала яе, нармальнасці гэтай. А ўжо Савецкая Расія і зусім звар'яцелай, нават крымінальнай была.

Найбольшай заганай Расіюшак было тое, што не ўмелі яны выкарыстаць тых агромных багацяў, якімі шчодра была надзелена іх краіна, на карысць сваіх народаў... А ці разумным было прадаваць багацейшую Аляску амерыканцам?! Што за парадокс: слабенькая і бедная тады Амерыка купляе сабе новыя тэрыторыі, а мілітарна моцная і багатая Расія — прадае свае, няхай сабе і не навечна. Сто гадоў — як бачым — стала вечнасцю. І з гэтай Аляскі толькі выціснулі і надалей выціскаюць амерыканцы, што за выручаныя грошы маглі б яшчэ купіць і Камчатку, і Чукотку, і іншыя тэрыторыі. Падобна чукчы дасюль не могуць выбачыць амерыканцам, што яны купілі Аляску, а не Чукотку... Дзе ж тут сэнс, дзе логіка?! І гэта не адзінае вялікае глупства зробленае царскай Расіяй...

І тое, што не лічыліся і надалей не лічацца ў Расіі са сваім народам, соллю іх, і кожнай іншай, зямлі. У царскую Расію, напрыклад, ехалі многія іншаземцы, каб зрабіць там кар'еру. Бо намнога лягчэй ім было зрабіць там кар'еру, як у сябе дома. І ўжо зусім смешна, што ў Расіі было лягчэй зрабіць кар'еру іншаземцу, як свайму расіяніну. Проста ў Расіі больш давяралі і шанавалі чужых, як сваіх. Сярод прышэльцаў былі, канешне, розныя людзі: як карысныя і стаўшыя пазней патрыётамі яе, так і розныя прахадзімцы і авантурысты, якія ненавідзелі Расіі і ўсяго рускага — і толькі шкодзілі ёй. Адным словам, былі сярод іх Нобелі і былі Дантэсы. Першапачатковы капітал славутай Нобелеўскай прэміі, напрыклад, быў зароблены шведам Альфрэдам Нобелем у Расіі.

Свайму ж расійскаму народу жылося ў Расіі даволі цяжка і адносіны да іх сваіх чыноўнікаў былі — як сказаў бы У. Маякоўскі — плёвыя.

Яшчэ больш плёвымі сталі адносіны паміж уладай і народам у Савецкай Расіі. Застагналі тады моцна людзі, збяднелі і яшчэ мацней распіліся. Заграніччнікі пачалі мінаць цяпер Расію, а хто не мінаў, толькі і бачылі яго, бо рыў ён дзесьці золата на Калыме. А вось заграніччныя камуністычныя партыі і антыкапіталістычная дзейнасць шчодра фінансавалася з савецкай дзяржаўнай касы. Дзеля прапаганды савецкага дабрабыту масава вывозілі з Расіі мяса, муку і іншыя дэфіцытныя тавары „галадаючым" рабочым заходніх краін, калі свой народ сапраўды галадаў...

Такая неразумная палітыка давяла да таго, да чаго раней ці пазней мусіла давесці: савецкая дзяржава і ўвесь сацыялістычны лагер распаліся, абанкруціліся.

Цяпер і ў Расіі будуецца капіталізм. Будуецца паволі, цяжка, часта крымінальным спосабам. І менавіта так ён будзе будавацца там яшчэ доўга. Бо так паволі і апорна змяняецца савецкая ментальнасць расіян.

Мяне проста шакіравала тэлеперадача „К барьеру" канала НТВ расійскага тэлебачання на тэму: Фелікс Дзяржынскі — забойца ці герой, патрыёт? Вёў перадачу, здаецца, У. Салаўёў, а апанентамі ў ёй выступілі Барыс Нямцоў ад правых сіл і камуніст Нікалай Харытонаў. Ці то дзеля большай верагоднасці, ці страху Харытонаў прывалок з сабой на гэтую тэлеперадачу помнік свайго куміра, Жалезнага Фелікса, і паставіў яго каля сябе. Ну і пайшло-паехала. Камуністу Харытонаву Фелікс Эдмундавіч — гэта герой, патрыёт, абаронца пакрыўджаных, крыштальнай чысціні чалавек і ўсё такое іншае. Таму трэба абавязковыя вярнуць яго партрэты на сцены ўсіх міліцэйска-кадэбэшніцкіх участкаў, а яго бронзавую статую — на плошчу перад Лубянкай. І, канешне ж, вярнуцца да яго стылю і метадаў працы...

Барыс Нямцоў пункт па пункце абгаляў і абгаляў зверствы галоўнага чэкіста. Гэта ён знішчаў праваслаўнае духавенства, аграбляў цэрквы і манастыры, разрушаў іх, крывава распраўляўся з незадаволенымі, угробіў мноства нявіннага народу і прычыніўся да паўстання цэлай арміі сірот у Расіі. На ўсе яго злачынствы існуюць верагодныя факты і крывавыя дакументы...

І здавалася б, што гэтымі фактамі можна было нават мёртвага пераканаць, але не цвердалобага Харытонава. На жаль, аказалася таксама, што ў сучаснай Расіі намнога больш Харытонавых, як Нямцовых. Пазіцыю Харытонава падтрымала дзевяноста тысяч тэлегледачоў, а Нямцова — толькі шэсцьдзесят тысяч. І менавіта ў гэтым адна з найбольшых праблем сучаснай Расіі.

(працяг будзе)

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Нашто нам упаўнаважаны?

На Падляшшы адбылася кур'ёзная справа. Упаўнаважаны па справах нацыянальных і этнічных меншасцей Лешак Клеснік, назначаны адкліканым ужо тады ваяводам Янам Дабжынскім, калясіў па ваяводстве і падсоўваў прадстаўнікам некаторых меншасных арганізацый петыцыю да прэм'ер-міністра ў абарону адкліканага з пасады шэфа. Быццам бы Лешка Клесніка прасіў гэта зрабіць сам Ян Дабжынскі. Між іншым падсунулі такі ліст старшыні мусульманскай канфесійнай гміны ў Багоннікаx. Спадарыня старшыня петыцыю падпісала. У мясцовай прэсе тлумачылася:

— Пан ваявода Дабжынскі быў нам прыхільны. Быў у нас у кастрычніку мінулага года і выразна цікавіўся нашымі праблемамі. А ў снежні мелі мы ў мячэці новы дыван, які ён нам падараваў.

Сам Лешак Калеснік так тлумачыўся журналістам:

— Гэта ліст не ў абарону. Справа была ў абвяржэнні факту, што ў ваяводы быццам былі благія кантакты з меншасцямі. Мы хацелі гэта прэм'еру высветліць.

Наколькі я ведаю, чамусьці спадар Калеснік не дайшоў у сваім паломніцтве да прадстаўнікоў беларускага асяроддзя, а прынамсі да тае часткі, якая мне найбліжэйшая. Кажуць, быў у Гайнаўцы, у Бельску-Падляшскім. Колькі подпісаў сабраў ён і хто яшчэ падпісаўся гэта, мабыць, назаўжды застанецца таямніцай саміх Лешка Калесніка і Яна Дабжынскага.

Новы ваявода Багдан Пашкоўскі, калі даведаўся аб абарончых экскурсіях Лешка Калесніка, зараз жа яго адклікаў.

— Спадар Калеснік злоўжываў маім даверам, таму такое рашэнне было неабходнае, — тлумачыў „Ніве" ваявода Пашкоўскі.

— А калі будзе назначаны новы ўпаўнаважаны і ці ўвогуле будзе?

— Не хачу вязацца ніякім тэрмінам. Гэта будзе залежыць ад розных абумоўленасцей.

— А ці ёсць сэнс назначаць такога ўпаўнаважанага?

— Я думаю, што ў нашым рэгіёне — несумненна.

Як і Лешак Калеснік, так як і яго папярэднік з часу кіравання СЛД Марэк Лібэрадзкі для меншасных асяроддзяў шмат не зрабілі. Найбольш былі актыўнымі, арганізуючы сустрэчы чарговых ваяводаў з меншасцямі. Меншасці скардзіліся, прасіліся. Ад другога боку гучалі абяцанні. Аднак з іх рэалізацыяй былі праблемы.

Я задумваюся над тым, ці ўвогуле ёсць сэнс функцыянавання ўпаўнаважанага ваяводы па справах меншасцей. Урэшце ж праблемы звязаныя з дзейнасцю гэтых асяроддзяў вырашаюцца хоць бы ў рамках супольнай камісіі ўрада і меншасных арганізацый ды непасрэдна з іх апекуном, прадстаўніком урада: Міністэрствам унутраных спраў і адміністрацыі, а раней Міністэрствам культуры і нацыянальнай спадчыны. А ваявода ж з'яўляецца прадстаўніком урада ў глыбінцы. Сам вырашальна і фінансава можа няшмат. А спасылаючыся на змест ліста, які падсоўваў Лешак Калеснік, варта прыгадаць інцыдэнты, якіх віноўнікам быў ваявода Дабжынскі, хоць бы звязаныя з яго непрысутнасцю ў час праваслаўных набажэнстваў з нагоды нацыянальных свят. І ўрэшце маю адчуванне (можа, неабгрунтаванае), што функцыянаванне ўпаўнаважаных ваяводаў па справах меншасцей служыць толькі свайго роду дымавай заслонай для ўражлівых у меншаснай тэматыцы структур Еўрасаюза. Рэальна клопат ваяводы аб меншасцях перакладваўся б хоць бы тады, калі б, напрыклад, назначыў на пасаду аднаго са сваіх намеснікаў прадстаўніка меншасці ў рэгіёне, у якім найбольшую па ліку меншасць складаюць беларусы. Так, як зрабіў гэта прэзідэнт Беластока, назначаючы адным са сваіх намеснікаў Аляксандра Сасну. Ну, дык што ж. Здаецца, *daremne żale, próżny trud.*

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ ЧАТЫРНАЦЦАТЫ РАЗ

Хор Гайнаўскага дома культуры

„Родына” з Дубяжына

Беласток 10.02.2007

Незалежна ад адсутнасці міністэрскай дапамогі МУСіА фестываль беларускай песні мусіў адбыцца. Без раённых элімінацый, адразу цэнтральны. Арганізавала яго Таварыства беларускай культуры разам з Беларускім грамадска-культурным таварыствам (адрас такі самы — Беласток, вул. Варшаўская, 11). Фінансава дапамаглі Маршалкоўская падляшская ўправа, прэзідэнт горада Беластока, Пасольства Рэспублікі Беларусь, Вышэйшая менеджэрская школа ў Беластоку (яе рэктар Міхал Лісоўскі вялікі аматар роднай песні), кааператыў інвалідаў „Падляшша”, прыватныя спонсары — Яніна Станкевіч і Сяргей Якушэвіч з Беластока, Юрый Васілюк з Гайнаўкі. Пасобілі таксама мясцовыя самаўрады, даючы транспарт калектывам (як сказалі спявачакі з „Нараўчанак”, іх калектыў трактуецца войтам і самаўрадам як візітная картка гміны).

„Ім яшчэ хочацца!” — пракаментавалі шматлюдна сабраныя гледачы (білеты на ўваход на мерапрыемства былі платныя па зразумелай прычыне), убачыўшы, як узбіраюцца на сцэну ўрачыста апранутыя ў беларускія строі немаладыя жанчыны са Збуча („Збучанкамі” кіруе Кацярына Ціханюк). Хочацца паказацца, праспяваць найлепшыя творы, для якіх збіраліся яны — не толькі яны — не адзін год, працягваючы традыцыю, перадаючы яе маладзейшым. Для ўсіх гэта вялікае свята — фестываль беларускай песні, і адчулі яны як асабістую крыўду тое, што БГКТ не падтрымліваецца міністэрствам, а нават, як адзначыў старшыня БГКТ і заадно віцэ-старшыня ТБК Ян Сычэўскі — *польскай дзяржавай*. І гэта ў год ад юбілею пяцідзесяцігоддзя існавання БГКТ. Іншыя кажуць, што БГКТ хацела б мець манаполію на арганізацыю культурнага жыцця беларусаў, і што не толькі фальклорна-народнае яно, тое сучаснае жыццё беларускай меншасці ў польскай дзяржаве. А 60 калектываў, якія шчыруюць на сваіх палетках і на ўсёй беларускай ніве — гэта людзі адданыя роднай культуры і заслужаныя для ўсяе нашай культуры ў краіне. Перш за ўсё тыя, хто працягвае традыцыю аўтэнтычнага фальклору.

Кацярына Ціханюк

Амелія Горбач

Сярод выканаўцаў **аўтэнтычнай фальклорнай песні** непраўзыдзеныя былі Крыстына Сульжыцкая з Варшавы і Вера Нічыпарук з Маліннік. На другіх месцах апынуліся Вольга Ахрымюк з Чыжоў і Валянціна Клімовіч з Дабрывады, на трэціх — Валянціна Марціновіч з Краснага Сяла, Зіна Пацэвіч з Нараўкі і Кацярына Ціханюк са Збуча. Сярод дуэтаў, тэрцэтаў і квартэтаў І месца здабылі тэрцэт „Жэмэрва” са Студзіводаў і квартэт „Васілёчкаў” з Бельска, ІІ — сямейны дуэт Ала і Іаанна Юзафовіч з Беластока, Ніна Аўгустыновіч і Валянціна Кажанецкая з Агароднічак, ІІІ — тэрцэт „Крыўчанкі” з Крыўца і квартэт „Збучанкі”. Сярод вакальных ансамбляў на І месцы: „Жэмэрва” са Студзіводаў, „Арэшкі” з Арэшкава, на ІІ — „Родына” з Дубяжына, „Згодныя макі” з Райска, на ІІІ — „Журавінкі” з Агароднічак і „Малінкі” з Маліннік.

Сярод выканаўцаў **апрацаванай фальклорнай песні** перамогу атрымалі Юрый Карпюк са Старога Ляўкова і Уладзімір Іванюк з Беластока, а на ІІ месцы апынуліся Ніна Шыманская з Орлі і Мікалай Іванчук з Бельска-Падляшскага. У дуэтах, тэрцэтах і квартэтах першымі былі моладзевае трыо з Беластока, дуэт Люба Гаўрылюк і Уладзімір Іванюк з Беластока, на ІІ месцы: дуэт Ніна Шыманская і Ян Стасюк з Орлі, на ІІІ — мужчынскі квартэт „Чыжавян” і квартэт „Арлян”, а вылучаны быў сямейны дуэт Ірэны Лапінскай і Юркі Карпюка са Старога Ляўкова. Сярод вакальных ансамбляў І месца ўзяла вакальная група з Нарваўскага дома культуры, ІІ — „Рэчанька” з Козлікаў, мужчынская група хору „Крыніца”, жаночая група бельскіх „Васілёчкаў”, а ІІІ — „Цаглінкі” са Старога Ляўкова, жаночая група Гайнаўскага дома культуры і моладзевая група „Цаглінак”. Вылучаны быў „Асенні ліст” з Гарадка. Сярод вакальна-інструментальных гуртоў найлепшай была жаночая група „Маланкі” з Бельска-Падляшскага. На ІІ месцы — цэлая „Маланка”, а на ІІІ — „Калінка” з Залук. Найлепшыя эстрадныя калектывы: „Лайланд” з Беластока (ІІ месца) і „На мэжы” з Дубіч-Царкоўных (ІІІ месца). Сярод хораў: І месца — „Куранты” з Бельска-Падляшскага, ІІ — „Васілёчкі” з Бельска-Падляшскага, ІІІ — хор Гайнаўскага дома культуры.

„Калінка” з Залук

Сярод выканаўцаў **сучаснай песні** на першым месцы апынуліся тры салісткі — Амелія Горбач з Гайнаўскага белліцэя, Ала Каменская з Козлік і Марыя Врублеўская з Гарадка, на ІІ — Юліта Назарка з Гайнаўкі і Эдыта Русіновіч з Бельска, на ІІІ — Магдаліна Чыквін з Гайнаўкі. У дуэтах найлепшыя былі Люба Гаўрылюк з Алай Каменскай з Козлік. У вакальных калектывах перамог „Расспяваны Гарадок”. Дзявочая група беластоцкіх „Каласкоў” і жаночая група хору „Крыніца” разам заваявалі ІІ месца. На ІІІ: жаночая група „Чыжавян” і цэлыя „Чыжавяне” з Чыжоў. Эстрадныя гурты традыцыйна разварушылі публіку. Перамагла „Знічка” з Гайнаўскага белліцэя, на ІІ месцы: калектыў „Дзявочыя ноткі” з Бельскага белліцэя, гурт „Вегас” з Беластока ды на ІІІ — беластоцкая „Зорка”. Сярод вакальна-інструментальных ансамбляў другое месца журы прысвоіла ансамблям „Белы сон” з Беластока і „Арт-Пронар” з Нарвы. Роўныя два другія месцы сярод хораў заваявалі „Крыніца” і „Каласкі” Беластока.

Пачуць можна будзе ўсіх найлепшых выканаўцаў у час галаканцэрта, які адбудзецца праз пару месяцаў, мабыць, у чэрвені, у час Свята беларускай культуры.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

З Богам ці з чортам?

Ужо прайшо свята Ражджаства Хрыстовага, Новы год і Хрышчэнне Гасподняе, ужо і бацюшка высвенціў наш дом, а я ўсё ўспамінаю каляднікаў. Не раз думаю, што цяпер носяць у сэрцы маладыя людзі, якія ідуць калядаваць? Кожнаму вядома як нялёгка пражыць сям'і з невялікай зарплаты.

Перад Божым Нараджэннем я рашыла, што прымем усіх каляднікаў. Дзецям і падлеткам дамо па 2 злоты. Калі ўсе іх прымуць да каго зойдуць, то хопіць ім на цукеркі. Больш грошай трэба даць тым, што калядуюць на царкву.

На першы дзень свята, калі ўжо было цёмна, мой муж выйшаў на двор. Праз нейкі час застукалі да нас каляднікі. Упусціла я іх. Не было ў іх гвязды і фанароў, толькі невялічкая скрыначка, дзе быў прыклеены абразок з выявай Нараджэння Ісуса Хрыста. Калядавалі дзве дзяўчыны, каля пятнаццаці гадоў ім было, і хлопец гадоў пад дзесяць. Заспявалі яны калядную песню і я дала ім 2 злоты. Калі яны выходзілі я спытала, чаму няма ў іх гвязды і фанароў? „Гвязда цяжкая", — адказала мне дзяўчына.

Вельмі мяне гэта здзівіла. Таксама было мне дзіўна, што калі спявалі калядку, у адной дзяўчыны зазвінеў мабільнік і яна выслала эсэмэску.

Калі каляднікі выйшлі ад нас, я выглянула ў акно. Перад блёкам стаялі два пятнаццацігадовыя хлопцы, і курылі папяросы. Нешта пагаварылі яны з каляднікамі і пайшлі далей. Праз хвіліну вярнуўся мой муж.

— Каго ты ўпусціла ў хату?! — крыкнуў ён злосна.

— Як каго? Каляднікаў.

— Ты ведаеш, што яны гаварылі? Тыя, што былі на двары, пыталі выходзячых ці многа сем'яў прыняло іх у гэтым блёку? „Толькі адна і то мала нам дала, ой, к... толькі два злоты".

Бачыш ты! Яны не збіраюць сабе на цукеркі, як ты гаварыла, але на папяросы і піва. Я закрываю дом і ніякіх каляднікаў не пускаю. Прыйдуць жанчыны калядаваць на царкву, то пушчу ў хату. Цяпер такіх жулікаў то не варта прымаць. Чуў я ад людзей, што здымаюць на мабільнік кватэру, а пасля прыходзяць, калі няма дома ўласнікаў, ломяць замок і абкрадаюць. Таму людзі не хочуць прымаць каляднікаў у горадзе.

— Што за часы? — падумала я. Ніколі так каляднікі сябе не паводзілі. Маладыя людзі змяніліся на горшае. Ідуць калядаваць, маючы чорта ў сэрцы.

Таполя

Конкурс

Вясна маладых талентаў

Ужо чацвёрты раз Гайнаўскі дом культуры (вул. Т. Саланевіч, 4) арганізуе пластычны конкурс, адрасаваны да дзяцей і моладзі ва ўзросце ад 5 да 20 гадоў.

На выстаўку трэба прынесці або даслаць прынамсі тры працы ў тэрміне да **30 сакавіка 2007 года.**

Пятнаццаць аўтараў найлепшых прац атрымае званне „Талент-2007" і ўзнагароду. **(мох)**

— Песні з Арлянскай зямлі распачаў я збіраць ужо ў 1978 годзе. Тады рабіў я падборку песень да абраду „Хрысцін", аб якім пісаў магістэрскую работу. Пасля з'ездзіў я ўсю Беласточчыну запісваючы народныя творы, — заявіў музыкант, фалькларыст і нястомны аніматар культуры сярод падляшскіх беларусаў Сцяпан Копа.

З песнямі Арлянскай гміны

Жыхары Бельшчыны, якія 9 лютага запоўнілі самую вялікую выставачную залу ў філіяле Падляшскага музея ў Бельску-Падляшскім, з захапленнем слухалі даўніх песень у выкананні жанчын з Арлянскай гміны, якія яшчэ ў міжваенны перыяд знаёміліся са словамі і мелодыяй многіх народных твораў. Шмат цёплых слоў ад жыхароў вёсак і людзей культуры пачуў энтузіяст збірання і апрацоўкі народнай творчасці Сцяпан Копа. Старэйшыя жанчыны з яго роднай вёскі Маліннікі і суседніх сёл мелі нагоду падзякаваць яму за апрацаваны ім зборнік „Песні Бельскай зямлі. Гміна Орля", выдадзены Аб'яднаннем „Музей малой айчыны ў Студзіводах" у супрацоўніцтве з Ваяводскім асяродкам анімацыі культуры. Старшыня згаданага аб'яднання Дарафей Фіёнік і заадно кіраўнік Студзіводскага музея таксама вядомы аматар збірання і публікавання народнай творчасці. Разам з музейным калектывам „Жэмэрва" запісваў ён таксама народныя песні на тэрыторыі Арлянскай гміны. Члены старэйшага і малодшага складаў „Жэмэрвы" мелі нагоду праспяваць іх перад публікай сабранай у музеі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Сядзяць злева: Марыя Амельянюк, Сцяпан Копа і Дарафей Фіёнік. Чацвёртая справа стаіць Надзея Сахарчук

— Песні з Арлянскай зямлі распачаў я збіраць ужо ў 1978 годзе. Тады рабіў я падборку песень да абраду „Хрысцін", аб якім пісаў магістэрскую работу. Пасля з'ездзіў я ўсю Беласточчыну запісваючы народныя творы, — заявіў музыкант, фалькларыст і нястомны аніматар культуры сярод падляшскіх беларусаў Сцяпан Копа. Рэзультатам яго шматгадовай працы былі выдадзеныя зборнікі народных песень Міколы Ігнацюка з Рыбалаў, з рэпертуараў калектываў з Дабрывады, Тыневіч і Арэшкава, а таксама „Падляшскі спеўнік", у якім апынуліся, між іншым, песні запісаныя ад Надзеі Сахарчук з Маліннік. У прэзентаваным у бельскай ратушы зборніку „Песні Бельскай зямлі. Гміна Орля" змешчана ажно каля ста песень, што заспявала Сцяпану Копу Надзея Сахарчук.

— Песень вучылася я ад старэйшых дзяўчат і жанчын. Найбольш любіла я песні пра любоў, але спявала таксама хрысцінныя, вясельныя і земляробчыя. У маладосці спявала я разам з сяброўкамі, а пасля ў час пакудзелля і іншых заняткаў, — скажа пазней Надзея Сахарчук. Вядомая яна таксама з любові да рукадзелля і народнай паэзіі. У час сустрэчы ў Бельску спявала яна песні і чытала свой верш, якога вялікая частка надрукавана ў зборніку. Фальклор вёскі Маліннікі прэзентаваў калектыў „Малінкі". Вельмі ўдала выступіла Марыя Амельянюк з Градалёў са сваёй дачкой Валянцінай Марціновіч з Краснага Сяла, якая зараз спявае ў калектыве „Малінкі".

— Я вельмі любіла спяваць і ад маладых гадоў вучылася песням. Цяпер яшчэ спяваю, калі мне весела, — гаворыць Марыя Амельянюк. Валянціна Марціновіч кажа, што многа песень навучылася ад мамы і некаторыя з іх прапануе ўключыць у рэпертуар „Малінак". Песнямі запісанымі ад Марыі Амельянюк карыстаецца таксама „Жэмэрва".

— Сярод амаль трохсот песень змешчаных у зборніку непаўторнымі творамі з'яўляюцца песні, прысвечаныя немаўлятам. Нідзе ў іншым месцы не спаткаў я назвы „чудры вэчур", у адносінах да навагодняга шчодрага вечара. Песні сабраныя мною гэта народная творчасць, якая вусна пераказвалася і часта мяняліся ў іх некаторыя словы. Ёсць у зборніку песня запісаная ў шасці варыянтах, — гаворыць галоўны інструктар па справах фальклору пагранічча ў Ваяводскім асяродка анімацыі культуры ў Беластоку Сцяпан Копа, які пакідае для музыколагаў, этнолагаў і культуразнаўцаў вельмі багаты матэрыял.

— Праца па выданні зборніка распачалася пасля леташняга фестывалю „Там по маёвуй росі". Спачатку спонсарам згадзіўся быць бельскі магістрат, а пасля фінансава рашыліся ўспамагчы наша выданне Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі і Ваяводскі асяродак анімацыі культуры ў Беластоку (там праводзілася тэхнічная апрацоўка кніжкі) ды сем'і Чыжыкаў і Амельянюкоў з Бельска-Падляшскага, — інфармуе Дарафей Фіёнік, які таксама дзякаваў дырэктарцы Музея ў Бельску Аліне Дэмбоўскай за супрацоўніцтва ў галіне прэзентацыі фальклору. За працу ў карысць захавання народнага фальклору дзякавалі Сцяпану Копу і Дарафею Фіёніку войт Арлянскай гміны Пётр Сэльвясюк, віцэ-дырэктар ВААК Барбара Пахольская, дырэктар Бельскага дома культуры Сяргей Лукашук і іншыя людзі культуры.

— Кніжка з'яўляецца незвычайным запісам моўнага, музычнага і духовага коду нашых продкаў. Арыгінальныя тут напевы, а асабліва вылучаюцца вясельныя творы і рагулькі. Песні спявалі людзі на мове, што замацавалася ў іх сёлах і яна наогул у Арлянскай гміне падобная. У мінулым, калі замацоўваліся ў нас народныя песенныя творы, нашы людзі прымалі таксама культуру ад расіян, украінцаў, ці палякаў і таму наглядаюцца разнародныя матывы ў песнях захаваных па сённяшні дзень. Засталіся ў вёсках таксама рускія песні савецкага перыяду. Няма аднак сумнення, што ў Арлянскай гміне у пераважнай большасці жывуць беларусы. Калі ў час апошняга перапісу насельніцтва больш за 70% людзей заявіла, што яны беларусы, то нельга падважаць іх волю, — кажа Дарафей Фіёнік.

У зборніку песень з Арлянскай гміны народныя творы надрукаваныя перад усім паводле календарнай абраднасці і згодна сямейным святкаванням (сярод іх найбольш вясельных і хрысцінных песень).

— Шэдэўрамі ў прэзентаванай кніжцы аказаліся прыбаўткі. Гэта песні казачнага зместу, у якіх у людскія постаці ўвасабляюцца звяры, мухі, камары або грыбы. Чатыры такія творы памятала Надзея Сахарчук, — кажа Дарафей Фіёнік.

Найбольш песень сабраных было ў вёсках Маліннікі, Градалі, Алекшы, Кошкі і Рудуты.

— Запіс народных песень гэта вельмі цікавая праца, якая патрабуе многа часу. У частцы вёсак цяжка было знайсці асоб, якія памяталі б словы і мелодыю песень. З агульнага ліку 23 сёл Арлянскай гміны змог я сабраць песні з 12 вёсак. У некаторых сёлах адсылалі мяне ад хаты да хаты, бо многія старэйшыя асобы не памяталі ўжо песень. Іншыя жанчыны не хацелі спяваць, бо была ў іх жалоба па блізкіх, — успамінаў пра складанасці сваёй работы Сцяпан Копа, які заявіў, што хацеў бы яшчэ выдаць кніжку з рэпертуарам „Крыўчанак" і песень сабраных у наваколлі Крыўца. Сустрэча ў ратушы закончылася ўспамінамі і супольнымі спевамі.

Аляксей МАРОЗ

Гацькоўскія танцы

У Гацьках адбываецца змаганне за зямлю. За зямлю, якую „народная ўлада” адабрала мясцовым земляробам у перыяд калектывізацыі, а цяперашняя ўлада, свая, „тутэйшая”, не хоча яе вярнуць мясцовым нашчадкам былых уласнікаў. Сённяшняя войт Раіса Раецкая ў пісьме таварыству „Гай” спасылаецца на тое, што цяпер тая зямля з’яўляецца ўласнасцю казны і распараджаецца гэтай зямлёй сувальская філія ольштынскага аддзела, а пра праект прыродна-ландшафтнага ансамбля ў Гацьках не мае дастатковых даных, хаця манаграфію пра культурную цэннасць гарадзішча каля Гацькоў гміна мае (пра апошняе было і ў сёлетнім 2-м нумары „Нівы”). Менавіта той культурна-ландшафтны ансамбль стаў бы прыступкай для вяртання зямлі, бо ён прадбачвае не толькі ахову культурных каштоўнасцей, але і мясцовых людзей разам з іх спадчынай, якая вельмі таемным чынам апынулася ў руках вонкавых землехватаў, калі за яе вяртанне хадайнічалі мясцовыя земляробы. Стаў бы, калі б гмінныя чыны хацелі, бо згодна закону ад 16 красавіка 2004 года аб ахове прыроды Гмінная рада можа ўстанавіць такі ансамбль.

Гацькоўскія і навакольныя земляробы дзеля вяртання сваёй зямлі згуртаваў у таварыства „Гай” Ян Мордань. А штуршком для гэтага стала дзесяцігадовай даўнасці размова з тагачасным бельскім войтам Юрыем Ігнацюком. Ян Мордань акурат прапісваўся, калі пачуў, што ў гміне адбываецца нейкая канферэнцыя пра Гацькі. Спытаў тады войта, ці можна на тую канферэнцыю зайсці і паслухаць пра што на ёй мова. А войт не дазволіў, сказаўшы, што яна не мужыкам, толькі вучоным. У 1999 годзе адбыўся торг за адзін участак у Гацьках, аднак пра яго ўправа гміны вяскоўцаў не паведаміла; пра торг даведаліся яны толькі тады, калі новы ўласнік прыехаў араць „выйгранае” такім чынам поле. Іншыя ўчасткі таксама траплялі ў рукі вонкавых людзей, але калі за іх хадайнічалі мясцовыя, ім прад’яўлялі рознага роду бюракратычныя забароны. Аднойчы Ян Мордань зайшоў за парадай да гмінага юрыстконсульта, а той вельмі ясна выклаў, дзеля чаго ён на гмінным штаце:

— A Pan myśli, że radca to dla Pana? Radca jest dla Zarządu Gminy, a nie dla Pana!

Такому стаўленню спрыяе таксама менталітэт мясцовага насельніцтва. Бо спачатку ў таварыства „Гай” запісалася за 60 ахвотных, але толькі фармальна ахвотных, бо калі настаў час змагацца за зямлю, многія з іх адсыпаліся. Выкручваліся, што то часу трэба, што тое, што сёе... Некаторыя сяляне сталі баяцца, жыхары Парцава здаліся ў змаганні за вяртанне сваёй зямлі. А зноў нашы чыноўнікі вельмі любяць таварыствы, — дадае спадар Мордань, — абы толькі яны паперовыя былі, каб на справе нічога не рабілі. А калі людзі пачынаюць нешта рабіць, тады іх паперамі стараюцца закідаць. І ў нас людзям цяжка зладзіць з дэмакратыяй, бо ў дэмакратыі трэба з іншымі людзьмі дагаворвацца. А наш чалавек не хоча высоўваць носа, не хоча ніякіх разборак, не хоча ведаць пра афёры, каб хата з краю... І ўсе быццам аднолькава думаюць, каб не паказвацца, каб усё паціху.

У дачыненнях па лініі грамадзянін — чыноўнік усё яшчэ верх трымаюць чыны. Нашы людзі лічаць дзяржаўнае найважнейшым, а слова чыноўніка амаль законам. Калі Ян Мордань некалькі гадоў таму дабіваўся адхілення войта Ігнацюка, дык шмат мясцовых людзей абуралася за такі замах. Такі ж пункт гледжання і ў чыноўнікаў, пра што, здаецца, красамоўна сведчаць прыведзеныя вышэй прыклады ранейшага войта і юрыстконсульта. Гэта спадчына ад мінуўшчыны, ад якой не хочуць адмовіцца мясцовыя грамадскія актывісты, якія на словах змагаюцца за інтарэс нашага насельніцтва, нашага грамадзяніна, а на справе... А на справе г.зв. „Бельская кааліцыя” на апошніх самаўрадавых выбарах прапіхала ў войтаўскае крэсла таго ж самага Ігнацюка, пры якім мясцовым людзям была адмоўлена зямля іх продкаў.

Цяперашняя войт Раіса Раецкая таксама з’яўляецца паклонніцай не гістарычнай, але пакінутай Ігнацюком спадчыны. У тэлефоннай размове са мной яна наракала, што захады таварыства „Гай” па папулярызацыі мінуўшчыны Гацькоў прыносяць клопат, бо пастаўленыя інфармацыйныя табліцы, як яе інфармуюць, нехта нішчыць. На маё пытанне пра ейныя асабістыя адносіны да ўстанаўлення прыродна-ландшафтнага ансамбля побач Гацькоў, яна спаслалася на... адсутнасць рашэнняў Ваяводскай рады аховы прыроды. Ідэальная чыноўніца — у сённяшняй „варшаўцы”, якая катаецца на прынцыпе „BMW”, яна справядліва магла б стаць міністрам! Да таго ж у мяне склалася ўражанне, што для спадарыні Раецкай найлепш было б, калі б Гацькамі ніхто не дурыў ёй галавы...

У нашай тутэйшай спецыфічнай сітуацыі выбарныя пасады часта з’яўляюцца толькі вынікам плебісцыту, вынікам праваслаўна-каталіцкай дуэлі, вынікам змагання „рускіх” з „польскімі”. І крытычныя адносіны да „свайго” войта ці пасла могуць успрымацца нашым палярызаваным насельніцтвам як здрада, з асуджэннем. Выбраны такім чынам чыноўнік можа нічым не турбавацца: ён жа „свой”, „праваслаўны”, „рускі”! А ў „рускіх” яшчэ і дадатковая да гэтага спецыфіка...

Антон Чэхаў, пранікліві назіральнік рускага менталітэту, у апавяданні „Унтэр Прышыбееў”, прыводзіць крэда тытульнага героя: „Никто порядков настоящих не знает, во всем селе только я один, можно сказать, знаю, как обходиться с людями простого звания, и я могу всё понимать. Я не мужик, я унтер-офицер, отставной каптенармус, в Варшаве служил, в штабе-с, а после того, изволите знать, как вчистую вышел, был в пожарных-с, а после того по слабости болезни ушёл из пожарных и два года в мужской классической прогимназии в швейцарах служил... Все порядки знаю-с. А мужик простой человек, он ничего не понимает и должен меня слушать, потому — для его же пользы”.

Іншы даследчык рускай душы, Густаў Герлінг-Грудзінскі часам рас-

працяг ☞ 10

Гадавіна нараджэння Тадэвуша Касцюшкі

4 лютага 2007 года ў Косаве ў Брэсцкай вобласці Беларусі адбыліся ўрачыстасці з нагоды 261 гадавіны з дня нараджэння Тадэвуша Касцюшкі, арганізаваныя Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам.

Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел: намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леанід Цупрык, пасол ЗША ў Беларусі Карэн Сцюарт, пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, часовы паверaны ў справах Літвы Мар’юс Януконіс, генеральны консул Польшчы ў Брэсце Яраслаў Ксёнжэк і шматлікія прадстаўнікі грамадства.

Удзельнікі ўсклалі кветкі да помніка Тадэвушу Касцюшку, наведалі сядзібу-музей Тадэвуша Касцюшкі ў Мерачоўшчыне. Удзельнікі ўрачыстасцей наведалі таксама замак у Косаве, які плануецца аднавіць за бюджэтныя сродкі. Ужо падрыхтаваны праект рэканструкцыі замка.

Пасол па асобых даручэннях МЗС Беларусі Уладзімір Шчасны падчас урачыстасцей паінфармаваў, што па заяўцы беларускага боку ЮНЕСКА выдзелена 50 тысяч долараў на далейшую рэканструкцыю сядзібы-музея Тадэвуша Касцюшкі. Фінансавая дапамога працягу рэканструкцыі і бягучага функцыянавання аб’екта будзе ажыццяўляцца таксама з беларускіх бюджэтных сродкаў.

Госцям урачыстасці была прадстаўлена выдадзеная ў Брэсце ў 2006 годзе кніга „Андрэй Тадэвуш Бонавентура Касцюшка” аўтарства Леаніда Несцерука.

Прэс-служба Пасольства РБ

Медычны пункт

Медпункт у Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна) патрабуе касметыкі. Будынак, у якім ён памяшчаецца, стаў шэры і смутны. Пабудавалі перад ім ля ўвахода ў сярэдзіну дашок. Ён зацякае і з яго адпадае тынк. Малявання патрабуюць дзверы і аконныя рамы. Асабліва ад фасаднага, паказнога боку. Апрача таго аднаўлення патрабуюць плот і брама.

Варта адзначыць, што жыхары Старога Ляўкова не толькі патрабуюць: зрабіце нам тое, зрабіце нам яшчэ сёе. 10 студзеня г.г. Юлья Драўноўская і Ніна Саўко добраўпарадкавалі пляцоўку перад медычным пунктам. Звярнуліся яны да раднага з Ляўкова, каб гмінныя ўлады далі фарбу. Яны ўжо самі памалююць вокны, дзверы і агароджу, каб было прыгажэй.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 60 —

— Я ўжо ў Дзеда Мароза даўно не веру! — засмяялася Гражынка. — Ён, мабыць, даўно ўжо ў марозным небе, калі нават і жыў калісьці як святы Мікола. Ну, калі ўжо, дык падарункі можа мне прыносіць кожную нядзелю, а нават укідваць іх у комін ці засоўваць у шкарпэтку. Ну, не ўсё ў шкарпэтку ўлезе...

А пазапланавы падарунак ад Дзеда Мароза гэта быў лічбавы фотаапарат. Пра яго ведаў якраз Грак, ды доўга трымаў дзюбу зачыненую, бо сяброўка Дзеда Мароз, бабуля, узяла з яго грачынае слова. А грачынае слова — мур-бетон! — ламаць немагчыма. Гэта як кропка і амін. І Грак, адкрыўшы бабуліну таямніцу, маўчаў як магіла, хоць свярбела яму дзюба пра ўсё расказаць Гражынцы. Бо ягоная сяброўка марыла пра такі падарунак! А так усе ашчаднасці выдавала на праяўленне здымкаў. Бо звычайны фотаапарат быў заўсёды ў яе сумцы. А колькі можаш зрабіць здымкаў на адным фільме? А калі не атрымаецца? Бо Гражынка марыць стаць вядомым у свеце майстрам фатаграфіі. А здымаць найбольш любіць прыроду. Усё жывое!

— Ну, калі не верыш... Дзед Мароз дзейнічае не толькі ў Каляды ці Новы год.

— Дык што ён робіць у іншы час? — таптаўся па стале Грак і аж лопаў унутры ад смеху, уявіўшы радасць сяброўкі ад новага падарунка. А бабуля падышла да дзвярэй, бо хтосьці моцна застукаў.

— Ой, Дзед Мароз! — ахнула Гражынка.

На парозе стаяў дзядзька з сівай доўгай барадой ды сівымі валасамі, што ляжалі ззаду на сінім кажушку, аперты на кульбацы. З-за сеткі маршчын вясёла глядзелі цёмна-сінія вочы. Дзядзька, бо хоць моцна пасівелы, цяжка назваць яго было дзедам, на плячы трымаў зусім не мяшок з падарункамі, а рэпарцёрскую пацёртую торбу.

— Ці добра я трапіў? — з усмешкай спытаўся Дзед Мароз і стаў даставаць з сумкі кардонку, загорнутую ў чырвоную паперу. — Мяне да Гражынкі прыслалі. Тут падарунак за найлепшы яе здымак, які прымаў удзел у конкурсе.

Гражынка, хоць аж трымцела, каб адкрыць каробачку, жахнулася:

— А я нічога на конкурс не пасылала!.. Ай, бабуля, гэта вы! А вы адкуль узяліся?

— Рэдактар Тартак! — засмяяўся дзядзька. — Час ад часу, калі не думаю пра perpetuum mobile, памагаю верыць у Дзеда Мароза. Бо я ў яго верыць не перастаў!

Міра ЛУКША

БУДЗЁННЫЯ „ВАЛЯНЦІНКІ”!

Фота Ганны Кандрацюк

Дзень закаханых! Яго чакаюць многія дзяўчаты і хлопцы. Вераць яны, што нешта здарыцца. Мы наведалі сяброў у беластоцкай „чацвёрцы”. Дзяўчаты і хлопцы з пятага класа маюць свой погляд на гэтую справу. Паслухайма іх.

Оля Мазурук: — Для мяне „Валянцінкі” гэта звычайны, будзённы дзень. Нішто не памяняецца. Я не ведаю навошта зрабілі гэтае свята?! Яно зусім непатрэбнае. Аднак усе кажуць: „Валянцінкі” — вялікае свята. Якое свята? Людзі толькі купляюць кветкі, карткі, круціцца бізнес... Гэта такі „дурны” дзень закаханых. Для мяне гэты дзень зусім НЕПАТРЭБНЫ!

Кася Ватароўская: — Я люблю „Валянцінкі”, таму што ў гэты дзень я магу сказаць пра свае пачуцці. Магу сказаць бацькам як я іх люблю. Я ў жыцці яшчэ не дастала „Валянцінкі”, але люблю высылаць карткі.

Юліта Нікалаюк: — Не люблю „Валянцінак”, таму што ў гэты дзень памерла мая прабабка. Паводле мяне, „Валянцінкі” непатрэбныя. Чалавек заўсёды павінен даваць падаркі іншым.

Ніна Ваўранюк: — Шчыра кажучы, я не прападаю за „Валянцінкамі”, не люблю іх. Паводле мяне, чалавек, які кахае іншую асобу, павінен любіць у кожны дзень. Выглядае гэта так, што ў адзін дзень усе стараюцца некага „кахаць”. Гэта, проста, без сэнсу! Ці не лепш быць шчырым?

Эвеліна Магельніцкая: — Для мяне „Валянцінкі” гэта нармальны дзень. Я іх не люблю — бо яны нудныя. Нічога не памяняецца ад гэтага дня.

Лідка Пякарская: — Я адчуваю гэтае свята парознаму. Напэўна гэта не мой любімы дзень года. Тут няма цікавых абрадаў, іх увогуле няма. „Валянцінкі” для мяне нецікавыя. У мяне няма „сімпатыі”, а „Валянцінкі” гэта свята закаханых. Мне яны абыякавыя. Пакуль што я не думаю пра каханне.

Ігар Карнілюк: — Не люблю „Валянцінак”, яны доўгія, нудныя. У кветкавых магазінах чэргі ў 20 метраў, можна за іх зачапіцца і грымнуцца аб зямлю.

ЗОРКА

Пазнаем алфавіт

Няма сяброў

Жыў-быў адзін Зайка. Такога Зайку ва ўсім свеце шукай — не знойдзеш. Запытаеце: чаму? А вось паслухайце.

Як і кожны Зайка, ён вельмі любіў гуляць. Прачнецца ранюсенька — і давай гойсаць. Па лузе, па балоце, па ляску. Каго не сустрэне, кожнага зачэпіць. Убачыць Жураўля і, не прывітаўшыся, галёкае: „Зуравель! Зуравель!..” Жураўлю, канешне, крыўдна, просіць ён Зайку: „Хоць сёння памаўчы”. Зайка яшчэ мацней: „Зуравель! Зуравель!” Журавель, каб гэткага не чуць, прэч ляціць. А Зайка, рагочучы, далей спяшаецца. Жука ўбачыць — і давай крычаць: „Зук! Зук!” Жук натапырыць крыльцы: „Зайка, перастань”. Зайка сваё: „Зук! Зук!” Толькі тады супакоіцца, калі Жук пад купіну залезе, схаваецца. Вось той Зайка гойсае, цешыцца. „Каго ж мне яшчэ зачапіць?” — думае. Ага, угары Жаўрук кружыцца, песню спявае. Задзярэ Зайка галаву і на ўсю моц галёкае: „Заўрук! Заўрук!” Далей Жаўрук ляціць, песню перапыняе.

Аднаго разу Вожык пачуў, як Зайка дражніцца. „Жэўжык ты, — сказаў ён, ушчуваючы. Зайка ў адказ: „Сам ты Зэўзык. Зэўзык! Зэўзык!” З таго дня толькі сустрэне Вожыка і давай на ўсе лады: „Прывітанне, Зэўзык. Як жывеш, Зэўзык?” Бедны Вожык скруціцца ў клубочак, каб не чуць, каб не слухаць. А Зайка і вухам не вядзе: „Да сустрэчы, Зэўзык!”.

Так жыў Зайка цэлае лета. А восенню, калі лісце на дрэвах пажаўцела, Заяц-тата завёў яго ў лясную школу. Са ўсяго лесу Зайкі ў школу сабраліся. Пасадзіў іх Заяц-настаўнік на дубовыя калоды і пытаецца:

— Зайкі, з кім вы сябруеце?

Адзін Зайка кажа, што з Матылём, другі кажа, што з Вераб'ём, трэці кажа, што з Барсуком. А наш Зайка маўчыць, не азываецца. Падышоў да яго Заяц-настаўнік.

— Зайка, з кім ты сябруеш?

Заморгаў Зайка вочкамі.

— У мяне няма сяброў.

— Няўжо побач з вашым ляском ніхто-ніхто не жыве? — здзівіўся Заяц-настаўнік.

А Зайка адказаў:

— Жыве Жук, якога я называю Зук, жыве Жаўрук, якога я называю Заўрук, жыве Журавель, якога я называю Зуравель, жыве Вожык, якога я называю Зэўзык.

— Цяпер мне зразумела, чаму ў цябе няма сяброў, — сказаў Заяц-настаўнік.

Зайка паціхеньку прамовіў:

— Я не вінаваты. Літара „З” вінаватая.

Аляксей ЯКІМОВІЧ
„Займальны алфавіт”

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

—17—

Пасля сустрэчы з Маркам мы былі злосныя і таму ўсю зваротную дарогу вешалі на ім сабак! І дакаралі сябе: навошта ўсё дзяцінства мы дражніліся з ім? А зараз ён крыўдуе, не хоча нас ведаць?

— Што праўда, то праўда, — пагадзілася Віялета, — не было ў нас такога лета, каб мы з яго не смяяліся...

— Усё ж такі... мог бы нас падабраць з дарогі, — перабіла Марта, — а то прыкінуўся, быццам і не заўважыў! Я пра ўсё раскажу Паўліне. Хай папракне свайго дзядзьку.

— А хто гэта тая Паўліна? — спытала я.

— Яна жыве ў Альшанцы і вучыцца ў нашай школе. А яе мама — гэта старэйшая сястра Марка. Паўліна і зараз пабывае ў бабулі, значыць, у хаце Марка. Калі хочаш, — спытала мяне Віялета, — мы пазнаёмім вас з сабой.

— Вядома, хачу, — адказала я, але...

— Вось і яна! — усклікнула Марта. — Прыйшла эсэмэска ад Паўліны. Яна піша, што Марк нас бачыў на дарозе, як мы ішлі ў краму...

— Вельмі смешнае, — абурылася я, — жартачкі з нас строіць. Мы жа ж вярталіся з крамы... Напішы гэтай Паўліне, каб падзякавала дзядзьку.

У хаце мы расказалі пра ўсё бабулі, нашай размове прыслухоўваўся сусед Віця. Мы добра ведалі, што гэты чалавек, калі пра нешта пачуе, дык на другі дзень пра „тайну" гаворыць уся вёска.

На другі дзень я, Віялета і Марта запрасілі да сябе Паўліну. Калі дзяўчына даведалася, што я была калісць закаханая ў яе дзядзьку (Марку зараз 18 гадоў), ледзь не лопнула ад смеху. Мы расказалі ёй пра ўсе прыгоды, ды не забыліся і пра ўчарашні дзень.

— Марк просіць у вас прабачэння, ён падумаў, што вы ідзяце ў іншы бок, — сказала Паўліна. — Ну, а ваш сусед Віця ўчора званіў у гэтай справе, ён размаўляў з Маркам аж гадзіну...

— Што??? — я была ў шоку (хоць гэтая інфармацыя не павінна была мяне здзіўляць).

— Гэта магчыма, — пагадзілася Віялета, — Віця ўчора званіў маёй маме. Ён трымаў яе ля мабільніка 30 хвілін!

— А ці ён нармальны? — спытала я, — гэта ж каштуе.

— Тут справа ў іншым, — Віялета махнула рукой, — ён проста атрымаў ад фірмы 600 дармовых хвілін і цяпер звоніць як дурны, да каго пападзе...

Вечарам мы правялі Паўліну пад яе хату. Яна запрасіла нас папіць гарбаты, але мы развіталіся і пайшлі ў свой бок. Аднак штосьці на дапускала нас дадому. Каля хаты Ігната Шчужэўскага цікавала за намі зграя сабак. Мы пабаяліся ісці далей. Таксама не хацелі вяртацца да Паўліны, каб не сустрэцца з Маркам. Сабакі былі ўсё бліжэй і бліжэй! Не было рады — мы здаліся. Я напісала эсэмэску Паўліне, каб яна выйшла на панадворак.

— А што здарылася? — спытала яна.

— Сабакі дурнога Ігнася ўсюды бегаюць, — адказала Віялета. — Дапамажы нам... Страшнавата вяртацца.

— Ну, добра, — Паўліна зірнула на мяне, — папрашу свайго дзядзьку, каб ён вас адвёз.

— Не, не! — запратэставалі мы.

— Іду па яго! — захіхікала Паўліна. — Пэўна захоча навесці папраўку на вашы адносіны...

Я, Віялета і Марта нічога ўжо не гаварылі. Мы баяліся сустрэчы з Маркам. Але, калі мы ўжо ехалі на яго аўтамашыне, хлапец быў вельмі для нас мілы. На канец ён сказаў, каб пра ўсё мы паінфармавалі Вячаслава...

— Тады часцей буду атрымоўваць тэлефоныя званкі!

Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн:<lolcia05@wp.pl>

Вершы Віктара Шведа

Чаму малюешся, мама?

Ясь прыглядаецца маці,
Якая малюецца ў хаце.
І раптам ён маму пытае:
— Чаму ты свой твар так мараеш?

— Хачу выглядаць я прыгожа,
Не трэба мамы трывожыць.
— Ты дрэнна мяне мама судзіш.
Калі ж гэта дзейнічаць будзе?

А з дыназаўрам ксёндз не мае?

Ксёндз ходзіць зімняю парою
Да сваіх верных з калядою.
Пасля малітвы ён затым
Даў хлопцу абразок святы.

І тут была падзяка Бронка
За дараваную іконку.
Ды за хвіліну ён пытае:
— А з дыназаўрам ксёндз не мае?

Галерэя „Зоркі" (Беласток)

Кася Ватароўская

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 5,30.
Твая мянушка: Не маю мянушкі.
У жыцці хачу стаць, чаму: У жыцці хачу стаць настаўніцай, таму што я люблю дзяцей.
У сяброў цаню: Шчырасць, сакрэтнасць, адказнасць і сяброўства.
Не люблю: Сварак, вульгарнасці, папяросаў, алкаголю.
Па-беларуску размаўляю з: Цёцяй, дзедкамі, сябрамі і на ўроках беларускай мовы.
Мой любімы гурт: „Прымакі", „Зорка", „Blu Cafe".
Каля свайго дому пасаджу: Белыя і чырвоныя ружы, цюльпаны, сланечнікі, а таксама чарэшню ды яблыню.

Польска-беларуская крыжаванка № 7



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 3: Спорт, храм, не, клас, ер, след, шлюб, я, немач, тон, навык, статак, моц. Снег, перон, шмат, слава, ключык, хлеб, рад, ас, вянец.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Магдаліна Куптэль** з Гайнаўкі, **Рафал Скепка**, **Мартына Сакалоўская**, **Матэвуш Лапінскі** з Дубін, **Эвеліна Прабуцкая** з Нарвы. Віншуем!

ЯШЧЭ ПРА МАЛАДЫХ...

Інтэрв'ю з Аліцыяй СЕГЕНЬ-МАТЫЕВІЧ навуковым супрацоўнікам Вармінска-Мазурскага універсітэта, аўтаркай кніжкі і заадно сваёй дысертацыі „Пачуццё нацыянальнай тоеснасці моладзі беларускага паходжання, насяляючай усходняе памежжа Польшчы. Перспектыва міжкультурнай адукацыі".

Ілона Карпюк: Ты родам з Гайнаўкі. Якой Ты нацыянальнасці?

Аліцыя Сегень-Матыевіч: Я нарадзілася ў Гайнаўцы, дзе ўзрастала да дзевятнаццаці гадоў. Па нацыянальнасці я беларуска.

— У сваёй кніжцы пішаш пра ролю ліцэя ў фармаванні свядомасці маладога чалавека? Якую школу Ты закончыла і ці паводле Цябе мела яна ўплыў на Тваю асобу? Калі так, які?

— У 1991-1995 гадах я вучылася ў II Ліцэі з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы, што значна пасадзейнічала разбуджэнню нацыянальнай тоеснасці і дазволіла акрэсліць маю беларускую нацыянальнасць.

— Выязджаючы на навуку ў Ольштын, Ты дапускала думку, што там ужо застанешся? Ці думала Ты аднак вярнуцца на Падляшша?

— У 1995 годзе паступіла я на педагагічны факультэт у Ольштыне. Магчымасць застацца ставіла я ў залежнасць ад прапановы працы, якая давала б мне задавальненне, ад магчымасці прафесійнага развіцця. Я аднак упэўнена, што ў якімсь моманце свайго жыцця вярнуся на Беласточчыну, з якой я эмацыянальна моцна звязана, гэта мая асабістая айчына.

— Ці педагогіка была свядомым і мэтанакіраваным выбарам?

— Так, гэта быў свядомы выбар. Аб'ём праблем, якімі яна займаецца, вялізны. Яе дынамічнае развіццё ў XX стагоддзі прывяло да стварэння чарговай субдысцыпліны, якой з'яўляецца міжкультурная педагогіка (якая мяне якраз асабліва цікавіць). Яе мэта — стварэнне такой адукацыйнай сістэмы, каб яе ўспрымальнікі вучыліся ў шматкультурным грамадстве, каб былі ўражлівымі на іншасць, культурную адрозненасць, каб былі адкрытымі, талерантнымі і адмовіліся ад пачуцця культурнай перавагі наконт дыялогу, перамоў і абмену вартасцямі.

— Ці Твая нацыянальная свядомасць мае ўплыў на тэмы якімі займаешся?

— Мая беларускасць напэўна ў нейкай ступені паўплывала на маё зацікаўленне жыццём нацыянальных меншасцей у Польшчы, асабліва беларускай. Стан ведаў на тэму меншасці, іхніх традыцый, культур, рэлігій ці тоеснасці — не задавальняе. Аднак ва ўмовах дэмакратызацыі грамадскіх адносін, у абліччы інтэграцыі Польшчы з краінамі Еўрапейскага саюза праблемы нацыянальнай структуры, нацыянальная палітыка, страх і прадузятасць чакаюць падрабязных аналізаў. У сувязі з гэтым тэмы, якімі я займаюся і разглядаю ў публікацыях адносяцца да шырокага разумення адрозненасці, фармавання талерантнага стаўлення і прызнання іншых культур, да працы ў бок бесканфліктных норм паводзін у шматэтнічным грамадстве, але і пашаны для іншых традыцый, рэлігій і нацыянальных моў. Кранаю таксама праблемы супрацьстаўлення да ўсялякіх форм дыскрымінацыі меншасных груп, а таксама падрыхтоўкі да перамоў, абмену вартасцямі ды да дыялагічных узаемадзеянняў у сітуацыі памежжа.

— Вядома, што выхаванне вельмі важнае для будучага акрэслівання ідэнтыфікацыі маладога чалавека. Ці Тваё зацікаўленне ўзнікла з уласнага вопыту, тым болей, што асаблівым выпадкам ёсць сітуацыя жыцця меншасці?

— Маё зацікаўленне беларускай меншасцю, яе палітычным, культурным і рэлігійным жыццём узялося адтуль, што я сама ўзрастала ў беларускім асяроддзі, мела дачыненне да многіх праблем.

— Чаму якраз праблемы з тоеснасцю ў маладых беларусаў сталі тэмай шляху да доктарскага звання? Як гэта адносіцца да магістэрскай працы і ранейшых зацікаўленняў? Ясны, свядомы выбар ці доўгае даспяванне?

— Праблематыка беларускай нацыянальнай меншасці цікавіць мяне ўвесь час. Не было гэта відавочнае ў дзяцінстве, але пачало выспяваць, калі я паступіла ў беларускі ліцэй і пазней, у час магістэрскіх і доктарскіх штудыяў (дзейнасць у Беларускім аб'яднанні студэнтаў, дапамога пры арганізацыі фестывалю „Басовішча" і варшаўскіх канцэртаў з цыкла „Беларускі андэрграўнд"). У 2000 годзе абараніла я дыпломную працу пад загалоўкам „Школьніцтва для беларускай нацыянальнай меншасці на прыкладзе Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы — генезіс і развіццё", а ў 2005 годзе дысертацыю на тэму „Пачуццё нацыянальнай тоеснасці моладзі беларускага паходжання, насяляючай усходняе памежжа Польшчы. Перспектыва міжкультурнай адукацыі". Цяпер працую над абаронай дысертацыі, якая таксама датычыць праблем беларускай нацыянальнай меншасці.

— Твая кніжка выйшла ў 2007 годзе. Не баішся, што высновы ўжо неактуальныя, бо моладзь апытвалася, здаецца, каля шасці гадоў таму?

— Магчыма вынікі на сённяшні дзень ужо неактуальныя (апытанні праведзены былі ў 2000-2004 гадах, а аналіз дакументаў і анкет — у 2003 і 2004 гадах), але самае важнае гэта выцякаючыя адсюль высновы, якія складаюць навуковую аснову для планаваня ды канструкцыі адукацыйна-педагагічных дзеянняў, накіраваных на нацыянальную меншасць (апытанні паказалі, што школа не выконвае сваіх задач адносна прамоцыі навукі роднай мовы сярод меншасці). Правільнае прымяненне высноў можа быць таксама элементам нармалізацыі адносін паміж большасцю ды меншасцю, супольна насяляючых абшар „культурнага памежжа" і дапамагчы ў развіцці, а таксама прамоцыі асяроддзя маладой беларускай інтэлігенцыі ў Польшчы.

— Тэма і змест кніжкі ўцякаюць у пэўнай ступені ад нягнуткай педагогікі і яе тэорыі. Адкуль гэта вынікае?

— Кніжка прысвечана пачуццю нацыянальнай тоеснасці моладзі беларускага паходжання, насяляючай памежжа ўсходняй Польшчы. Можна сказаць, што гэта інтэрдысцыплінарная апрацоўка, паяўляюцца пытанні з галіны заканадаўства, гісторыі, паліталогіі, рэлігіі. Кніжка займаецца педагогікай грамадства з улікам міжкультурнай адукацыі, грамадскай псіхалогіі, сацыялогіі культуры і нацыі. Вынікае гэта са спецыфікі тэмы. Думаю, што немагчымым было б апісаць тоеснасць, абапіраючыся толькі на педагагічныя тэорыі, гэта складаная праблема, няўстойлівая, гэта з'ява, у якой шмат вымярэнняў, таму і аналіз патрабуе перспектывы розных галін навукі.

— Высновы Тваіх даследаванняў паказваюць даволі аптымістычную сітуацыю сярод беларускай моладзі, беручы пад увагу будучыню і жыццядзейнасць беларускай меншасці? Што паўплывала на такі прагноз?

— Вынікі выразна паказалі адраджэнне пачуцця нацыянальнай тоеснасці моладзі беларускага паходжання. У іхняй свядомасці працуюць традыцыйныя элементы пачуцця нацыянальнай тоеснасці, якія маюць асноўнае значэнне для яе захавання і развіцця, у тым ліку: рэлігія (74%), месца пражывання (74,9%), культура (91%) і свядомасць нацыянальнасці (71,1%). Па-мойму, такія вынікі спрыяюць аптымістычным прагнозам.

— Назіраючы сённяшнюю сітуацыю беларускай меншасці, якія маглі б быць вынікі паўторных даследаванняў?

— Агулам усё мяняецца. Думаю, што такім чынам і вынікі былі б іншыя, але нязначна, бо мае даследаванні закончыліся два гады таму.

— Тэма міжкультурнай адукацыі, якой Ты займаешся, з'яўляецца амаль асноўнай для будучыні беларускай меншасці і не толькі гэтай. Ты, аднак, канцэнтруешся ў галоўным на праблемах тоеснасці. Можна б акрэсліць гэта псіха-сацыялагічнай навуковай працай з шырокім гістарычным і тэарэтычным фонам? Такі быў намер?

— Тэарэтычнай мэтай было сабранне і ўпарадкаванне навуковых ведаў на тэму пачуцця нацыянальнай тоеснасці моладзі беларускага паходжання. Практычнай мэтай было даведацца, што прадвызначае працэс фармавання пачуцця нацыянальнай тоеснасці ў моладзі, акрэсленне ступені, у якой яна звязана з роднай мовай, культурай, рэлігіяй, гісторыяй, населенай тэрыторыяй. Але таксама дыягназ функцыянавання механізмаў і ўзораў грамадскага суіснавання, культурнага дыялогу ў этнічна дыферэнцыраваным асяроддзі. Выразна падкрэсліваю, што мая праца абапіраецца на тэорыю грамадскай тоеснасці Г. Тайфэля і самакатэгарызацыі Дж. К. Тэрнера, а таксама тэорыі тоесных захаванняў Т. Левавіцкага.

— Як бачыш будучыню беларускіх сярэдніх школ? Якія задачы павінны яны рэалізаваць? Да чаго яны ставяцца прыхільна, а што бясспрэчна абыходзяць?

— Стан асветы перш за ўсё вырашае аб ступені развіцця нацыянальнай культуры, а таксама мае ўплыў на падтрымку і мацаванне нацыянальнай тоеснасці. Школы для беларускай нацыянальнай меншасці з'яўляюцца самымі важнымі і будуць абумоўліваць развіццё і ўвогуле захаванне беларускай традыцыі, культуры, здабыванне ведаў пра гісторыю беларусаў і складванне нацыянальнай тоеснасці. На сённяшні дзень школы не да канца выконваюць сваю ролю ў прамоцыі роднай мовы.

— Ці апрача прамоцыі міжкультурнай адукацыі будзеш нешта рабіць у практычнай сферы?

— Безумоўна. Ужо цяпер вяду практычныя заняткі па грамадскай педагогіцы, у час якіх стараюся пераказваць студэнтам веды так, каб разбудзіць у іх уражлівасць на іншасць, каб вучыць талерантнасці, узбагачваць іхныя педагагічныя ўмеласці, тады напэўна лягчэй ім будзе займацца штораз то новымі „культурнымі" праблемамі сучаснасці.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

Быў беларускім дзеячам

Да 100-годдзя з дня нараджэння Пятра Ластаўкі

13 траўня 1956 года адбыўся арганізацыйны з'езд Варшаўскага аддзела БГКТ. Членам яго праўлення выбраны быў тады Пятро Ластаўка, які да самай смерці актыўна працаваў на карысць беларускай справы ў Польшчы.

Але беларускімі справамі Пятро Ластаўка захапіўся яшчэ тады, калі яму было толькі 14 гадоў, распаўсюджваючы нелегальныя адозвы, кніжкі, газеты. Ён нарадзіўся 16 лютага 1907 года на Дзісеншчыне ў беднай беларускай сялянскай сям'і. Вельмі рана застаўся без бацькоў, таму яшчэ хлопчыкам зведаў нялёгкую фізічную працу парабка і пастуха.

Калі хлопцу споўнілася 19 гадоў, уступіў у рады Беларускай сялянска-работніцкай грамады і стаў самым актыўным яе сябрам на Дзісеншчыне. За гэтую дзейнасць маладога Ластаўку польскія ўлады арыш-

Праўдападобна ў Забалацці ў 1942 г.

тавалі і пасадзілі за краты ў горадзе Глыбокае, а пасля перавялі ў Вільню. Праз год Пятра адпусцілі, але яго жыццё і дзейнасць пастаянна кантралявала паліцыя.

У канцы 1920-х гадоў Пятра Ластаўку забралі ў польскае войска.

З жонкай і яе пляменніцай у Брвінове (першая палова 1950-х).

Адбыўшы вайсковую павіннасць, ён зноў вяртаецца ў родную вёску і працягвае беларускія справы. Паліцыя строга кантралюе дзейнасць беларускага хлопца. Тады ён вырашае пакінуць родныя мясціны і едзе ў Варшаву, дзе яго чакалі новыя праблемы і выпрабаванні.

Злева: Пятро Ластаўка, Сяргей Паўловіч і Мікалай Дварэцкі, 1936 г.

Найважнейшым выпрабаваннем у вялікім горадзе быў пошук працы. Але з цягам часу праца знайшлася і дабавілася грамадская дзейнасць. Пятро Ластаўка знаёміцца з многімі беларусамі Варшавы, а пасля арганізуе Асветнае таварыства беларусаў у Варшаве. Вакол гэтага таварыства ён аб'ядноўвае многіх землякоў, якія жылі ў польскай сталіцы. Гэтае таварыства дзейнічала да пачатку вайны, а Пятро Ластаўка быў яго самаахвярным кіраўніком, які аддаваў усе свае сілы і веды таварыству і сябрам.

Калі пачалася вайна, Пятро Ластаўка пакінуў Варшаву і пераехаў жыць у Забалацце Белападляскай гміны, але сувязі з сябрамі-беларусамі не губляў. Ды і там ён праводзіў розныя цікавыя імпрэзы, сустрэчы, паціху займаўся палітыкай.

Калі скончылася вайна, Пятро Ластаўка вяртаецца ў Варшаву і жыве ў Мілянуўку. Ён па-ранейшаму не пакідае беларускіх спраў, а наадварот, яшчэ актыўней уключаецца ў працу Варшаўскага аддзела БГКТ. Доўгі час з'яўляецца сябрам яго праўлення, а пазней і сябрам Прэзідыума ГП БГКТ. А калі БГКТ мела права займацца гаспадарчай дзейнасцю, то спадар Ластаўка становіцца дырэктарам прамысловага прадпрыемства „Бэтэска" і кіруе гэтым прадпрыемствам ажно пяць гадоў.

Пятро Ластаўка быў яшчэ заядлым калекцыянерам, кнігалюбам, займаўся публіцыстыкай і літаратурай. Юры Туронак згадвае, што пасля смерці Пятра „ў 1968 годзе мне пашанцавала купіць усю яго калекцыю — блізу 20 беларускіх кніг, выдадзеных у ваенны час у Берліне, Варшаве і Менску" (Юры Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Вільня 2006, с. 324).

Пры жыцці Пятро Ластаўка вельмі цікавіўся лёсам варшаўскіх беларусаў. Мне прыемна згадваць сёння гэтага чалавека і таму, што ён добра ведаў і шчыра сябраваў у Варшаве з маім земляком Гальяшом Леўчыкам. Асабліва спадара Ластаўку цікавіў лёс паэта пасля 1944 года. Ён праводзіў розныя пошукі сярод жыхароў Варшавы і пытаўся ці хто ведаў і бачыў Гальяша Леўчыка. І, дарэчы, шмат цікавых фактаў знайшоў. 10 лютага 1967 года Пятро Ластаўка звярнуўся нават у ЗША да Яна Пятроўскага з просьбаю напісаць успаміны пра духоўнае жыццё Леўчыка. Ластаўка пісаў Пятроўскаму: „Пішу ўспаміны пра Гальяша Ляўковіча. І дзеля гэтага хацеў бы прыгадаць варшаўскі час такім, якім ён быў у сапраўднасці. Хіба вы не ведаеце, што Леўчык ужо не жыве. Ён памёр у верасні 1944 года на атаку печані ў цяжкіх абставінах, бо не было ніадкуль ніякае помачы... У наступным лісце перашлю Вам болей звестак пра апошні час жыцця і смерць Ляўковіча" (Ян Пятроўскі, *Мэмуары*, Слуцак — Гэйнсвільл 1988, с. 161). Далей у пісьме Яну Пятроўскаму Ластаўка пісаў, што ён ужо два гады як цяжка хварэе. „У маім далейшым лісце да Ластаўкі, — згадваў далей у сваіх „Мэмуарах" Ян Пятроўскі, — ад 24 чэрвеня 1968 года я пытаўся, як ён маецца і яшчэ раз прасіў падаць мне звесткі, якія адносяцца да апошніх

У час урачыстасці адкрыцця ліцэя ў Бельску-Падляшскім; уручэнне тэлевізара ад „Бэтэскі". Побач старшыня ГП БГКТ Лідзія Бялецкая, 1961 г.

дзён Ляўковіча. Але на гэты мой ліст я ніколі ўжо не атрымаў адказу".

Ян Пятроўскі звяртаўся з просьбаю і да сына Пятра Ластаўкі, але адказу больш ад сям'і Ластаўкаў ні-

За працай

колі не атрымаў. Тым больш, што 19 верасня 1968 года беларускага дзеяча ў Варшаве не стала. А сёлета 16 лютага спаўняецца 100 гадоў з дня ягонага нараджэння.

Сяргей ЧЫГРЫН
Фота з сямейнага архіва сына Пятра Ластаўкі, Рышарда

Нацыянальны і гаспадарчы дзеяч

Маланкава ўцякае нам час, беззваротна кануўшы ў вечнасць. Мінаюць дні, гады, а нават стагоддзі. Якраз споўнілася сотая гадавіна з дня нараджэння нястомнага змагара за беларускасць, дасканалага арганізатара, вернага сябра Пятра Ластаўкі. Так як і я быў ён вясковага паходжання, нарадзіўся толькі крыху раней і далей на ўсход, 16 лютага 1907 года, у вёсцы Жукі-Ложныя на Дзісеншчыне, у беднай сялянскай сям'і. Ад наймалодшых гадоў змагаўся ён за беларускасць з польскімі санацыйнымі ўладамі ў радах Беларускай работніцка-сялянскай грамады і Таварыства беларускай школы. Пасля ліквідацыі Грамады ў 1926 годзе польскія ўлады арыштоўваюць яго і асаджаюць у віленскай турме. Вярнуўшыся ў сваю вёску, у далейшым працуе ў беларускім руху. Праследаваны

Пятро Ластаўка (злева) і Віктар Швед (Варшава, 1960-я гады)

паліцыяй, вымушаны быў пакінуць родныя мясціны і выехаць у Варшаву. Уладкаваўшыся на працу ў Варшаўскім музычным таварыстве, Пятро Ластаўка ізноў прыступіў да грамадскай працы. Пры дапамозе польскага пісьменніка Мельхіёра Ваньковіча і верных сяброў-беларусаў удалося яму ў 1937 годзе заснаваць у цэнтры горада, па вуліцы Свентакшыскай 9, кв. 18, Асветнае таварыства беларусаў, якога быў сакратаром аж да вайны 1939 года.

Таварыства адыграла значную ролю ў культурна-асветнай працы беларускіх жыхароў сталіцы. З фінансавай дапамогай таварыству прыходзілі, між іншым, кампазітар прафесар Станіслаў Казура і старшыня таварыства Язэп Гапановіч. У праграмнай дзейнасці дапамагалі дзеячы самадзейнага беларускага мастацтва — кампазітар Аляксандр Шыдлоўскі, спявачка Людміла Панько і паэт Гальяш Леўчык, які на сустрэчах чытаў свае вершы і пад акампанемент гітары спяваў беларускія песні. Таварыства 24 мая 1938 года арганізавала канцэрт вядомага беларускага тэнара Міхася Забэйды-Суміцкага, а 3 ліпеня 1939 года — аўтарскі вечар паэта Максіма Танка.

Варта прыгадаць, што Пятро Ластаўка ў складзе дэлегацыі з трох чалавек уручыў прэм'ер-міністру II Рэчы Паспалітай *Мемарыял у справе беларускіх школ і пазашкольнай асветы*, апрацаваны Таварыствам беларускай школы і Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры (*Мемарыял* надрукаваны ў „Беларускім календары" на 1963 год).

Падчас другой сусветнай вайны Пятро Ластаўка жыў у вёсцы Заба-

працяг ☞ 11

http://hadzinski.narod.ru

Калісьці мне давялося пабываць у Венгрыі. Жанчына, якая апекавалася нашай турыстычнай групай, значыць, распавядала аб сваёй краіне і паказвала розныя яе знакамітыя мясціны, апавядала, што венгерская мова настолькі мілагучная і прыгожая, што найбольшая колькасць сярод усіх зямных паэтаў — гэта венгры. Памятаю, што спрачацца з ёй ніхто не стаў. Моўчкі меркавалі так — калі гэтая венгерка так упэўнена пра сваіх паэтаў і сваю мову гаворыць, то, магчыма, так яно і ёсць.

Не будзем з ёю спрачацца, бо беларусы, можа і не найбольш паэтычная нацыя ў свеце (хаця так гэта ці не яшчэ ніхто не даказаў), таксама маюць немалую колькасць тых, хто можа выкласці свае думкі ў вершаваныя радкі. Каб у гэтым упэўніцца, дастаткова зазірнуць на незвычайны сайт, які месціцца па адрасе http://www.hadzinski.narod.ru.

Даны партал гэта своеасаблівая прэзентацыя творчасці маладога мінчаніна Паўла Хадзінскага. Арыгінальнае афармленне сайта адразу кідаецца ў вочы. Галоўная старонка, выкананая ў блакітным колеры з рознымі яго адценнямі, месціць у сабе выйсці да розных рубрык і выяўленне нейкіх трох шароў. Што гэтыя шары азначаюць і дзеля чаго тут выяўлены застаецца загадкай. Але менавіта яны, як і азначэнне сайта („Старонка вітаньня і першых грукатаньняў усярэдзіне чытанак зацікаўленасьці") выклікаюць жаданне бліжэй пазнаёміцца з гэтым віртуальным зборнікам вершаў. А каб гэта зрабіць, трэба, зразумела, прайсціся па рубрыках.

Першая старонка носіць назву „Цыклы". Чаму аўтарам выбрана менавіта гэтая назва, для мяне асабіста засталося незразумелым. Але творчыя людзі, пэўна, мусяць мець нейкую загадкавасць, якая і адлюстроўваецца ў падобных вызначэннях. Тое ж самае можна сказаць і пра малюнак, што аздабляе старонку — зноў нейкія бліскучыя шары з шыпаванай каракаціцай пасярэдзіне. Дарэчы, многія з вершаў, якія змешчаны тут — нерыфмаваныя, так званыя белыя вершы.

Вершы размешчаныя і на некалькіх наступных старонках. Тут ужо падзел іх больш-менш зразумелы для непадрыхтаванага Інтэрнэт-карыстальніка. „Вершы", „Новыя рэчы", „Чарговасць новага" — вартыя прагляду дзеля больш поўнага разумення светапогляду Паўла Хадзінскага.

Адной з цікавых рубрык падаецца старонка „Не вершаванае". Тут аўтар размясціў тыя творы, якія па розных прычынах не здолеў выкласці ў рыфмаванай форме.

Старонка „Пра мяне" крыху адкрывае нам асобу паэта. Тут мы ўбачым яго фотаздымак і кароценькі расповед аб сабе. „Чалавек, пра якога вы зараз чытаеце, жыве ў Менску. Ён прагне адчыніць таямніцы існаваньня і дзеля гэтага стварае вершы. У іх можна адчуць подыхі сноў і верагодных сапраўдных зьдзяйсьненьняў, якія ўвесь час знаходзяцца побач, часам заблытваючы адно аднаго, але і надаючы новыя памкненьні для ўдасканальваньня".

Варта адзначыць, што гэтаму паэту ўласціва сціплась. Інакш ён наўрад ці змясціў бы на сваім сайце вершы іншых аматараў вершаванага слова. Рубрыка так і называецца „Творы сяброў". Кожная падборка вершаў таго ці іншага Паўлавага сябра, а з большага сяброўкі, аздоблена незвычайнымі выяўленнямі. На старонцы „Галерэя" месцяцца іх здымкі.

Ну, а каб пазнаёміцца з меркаваннямі аб сайце яго наведвальнікаў, трэба зазірнуць на старонку „Гасцёўня", якая выконвае ролю форуму.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Хворыя і нягеглыя

Прагназаванай няўдачай скончыўся для беларускіх біятланістаў чэмпіянат свету, што праходзіў цягам дзесяці дзён у памежным цірольскім мястэчку Антэрсельва. Загалоўкам не маю намеру пакрыўдзіць нашых страляючых лыжнікаў, закладаючы ў яго найперш спагаду і шкадаванне. Дзіўная рэч гэтыя трэнерскія тлумачэнні! Палову сезона слухаеш інтэрв'ю пра тое, што пік спартовай формы іх падначаленых мусіць прыпасці якраз на перыяд планетарнага першынства. А потым раптам (для шырокага кола) выяўляецца, што ледзь не ўсе ўдзельнікі нашай каманды замучаны хранічнымі траўмамі. Пытанне тады, навошта было ганяць бедных біятланістаў па малазначных этапах Кубка свету, выціскаючы з іх апошнія сокі. Здароўе ж людзей у кожным разе даражэй медалёў, а тым больш саракавых і пяцідзесятых месц. Гутарка ідзе найперш пра нашых хлопцаў, паколькі дзяўчаты ў прынцыпе выступілі ў сваю сілу.

Хоць пярэдадзень чэмпіянату свету прынёс для айчыннага біятлона новыя надзеі (трэцяе месца на кубкавым этапе Наталлі Сакаловай, процьма ўзнагарод Універсіяды, залаты медаль Яўгена Абраменкі і два сярэбных Дар'і Дамрачовай на юніёрскім першынстве), усім было зразумела, што гэта капітал на заўтрашні дзень. Першынство ў Антэрсельве пацвердзіла, што скласці канкурэнцыю прызнаным лідэрам сусветнага біятлона надзвычай цяжка. У выніку медалі заваявалі прадстаўнікі толькі сямі краін: Нямеччына — 11 узнагарод, Нарвегія — 7, Францыя — 6, Швецыя і Расія — па 3, Чэхія — 2, Украіна — 1. Прычым сенсацыю прынесла толькі адна гонка — у першы дзень спаборніцтваў бронзу ў спрынце ўзяў украінец Андрэй Дзярызямля. Ды крыху нечаканым сталіся стабільныя выступленні чэха Міхала Шлезінгра, які два разы ўпэўнена прабіўся на п'едэстал. У астатнім умовы дыктавалі фаварыты.

Беларуская каманда, як не раз ужо адзначалася, перажывае сапраўдную змену пакаленняў. Асабліва гэта датычыць жаночай каманды, за асноўны склад якой выступаюць цяпер Вольга Кудрашова, Наталля Сакалова, Дар'я Дамрачова, Людміла Ананька. Дзве першыя — расіянкі, якія прыехалі на Беларусь разам з цяперашнім галоўным трэнерам Яўгенам Калакольнікавым. Дамрачова імкліва ўварвалася ў эліту і толькі выхаванка Наваградка Ананька ўжо даўно ў нацыянальнай дружыне. На прайшоўшым чэмпіянаце кожная мела ў асабістым актыве прынамсі адзін добры выступ. Таму высокае 5-е месца ў эстафеце (нашы апярэдзілі прытым куды больш рэйтынгавую Расію, якая стала толькі сёмай). Каб яшчэ не сапсаваны першы этап у выкананні Кудрашовай...

У мужчын справы склаліся куды горш. Да ўсяго адчуваўся канфлікт у асяродку трэнерскага штаба. У эстафеце Сяргей Новікаў, Рустам Валіулін, Уладзімір Міклашэўскі і Аляксандр Сыман занялі ганебнае 20 месца (пры 22 удзельніках). А зусім яшчэ нядаўна ў гэтым відзе Беларусь стабільна прэтэндавала на п'едэстал і нават была чэмпіёнам свету. Толькі Новікаў выдатна адпрацаваў на стартавым этапе, прыйшоўшы трэцім. Валіулін па традыцыі „заваліў" стойку, астатнія выглядалі таксама блякла. Пра індывідуальныя гонкі і гаварыць не хочацца (лепшым стала 25 месца Сымана на дыстанцыі 20 км). А ў змешанай эстафеце мы сталі толькі 13-ыя. Карацей, трэба „залізваць раны" і спакойна (ці дадуць!?) адным лячыцца, іншым заканчваць сезон з прыцэлам на наступны.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Гацькоўскія танцы

5 ☞ працяг

крывае іншы свет. У „Дзённіку пісаным ноччу" пад датай 20 студзеня 1981 года згадвае ён пра рытуальны эпізод з канклаваў. Той рытуальчык стаў вынікам узніклай у сярэднявеччы легенды, быццам у палове IX стагоддзя на папскі трон была выбрана жанчына, якая да таго часу прыкідвалася манахам. Пасля выбару яна рассакрэцілася аднаму манаху, а той сквапна карыстаўся яе сакрэтным, забароненым для папскага трону месцам і праз нейкі час папа (папіха?) у часе працэсіі з Калізея ў касцёл святога Клімента нарадзіла проста на вуліцы карапуза. Легенда стала так папулярнай, што дзеля засцярогі ад сапраўднага выбару жанчыны на трон святога Пятра, пасля выбару электа, яшчэ перад выпускам белага дыму і аб'явай habemus papam, новаабранага саджаюць на спецыяльнае крэсла з дзіркай, праз якую наймалодшы на канклаве кардынал, стаўшы на калені, мацае тое што трэба і аб'яўляе: Testiculos habet, dignus est papali corona (Мае яйца, дастойны папскай кароны). А ў нас свет іншы, рацыянальны, не ватыканскі, у нас нават ніхто не мацае галоў кандыдатаў, ці яны дастойныя

чыноўніцкіх крэслаў, бо ж да тых крэслаў пасуе кожная ў прынцыпе с... Абы толькі была „свая".

6 лютага мела ў Беластоку адбыцца пасяджэнне Ваяводскай рады аховы прыроды, дзе мела абмяркоўвацца пытанне гацькоўскага прыродна-ландшафтнага ансамбля. Але не адбылося, бо новы ваявода хацеў але не мог на ім прысутнічаць. Магчыма, што гэта толькі адгаворка, што і ваявода чакае нейкага рашэння варшаўскіх вярхоў наконт Гацькоў. Невядома, на калі будзе вызначана чарговае пасяджэнне, на якім, магчыма, Раіса Раецкая даведаецца, які ў яе пункт гледжання на захаванне гацькоўскай спадчыны.

Мяне крыху інтрыгуе пытанне, чаму бельскія гмінныя ўлады прамоўчвалі перад жыхарамі Гацькоў згаданыя таргі на зямлю іх продкаў. Няўжо ж у войтаванне Ігнацюка падзейнічаў быў прынцып „маўчанне — золата"? Мне крыху падазраваецца, што абышлося тады без золата, што хапіла звычайных срэбранікаў. Бельская гмінная сакрэтнасць працягваецца і пасля Ігнацюка. Спадар Мордань сказаў мне, што яму намнога лягчэй даведацца пра бюджэтныя планы Браньскай гміны, чым сваёй Бельскай. У Боцькаўскай гміне ўжо абмяркоўваецца план пракладкі магістральнай шашы паміж Беластокам і Сямятычамі, а ў Бельскай гэта пакуль з'яўляецца тайнай. Мо гэтак таму, што адзін з варыянтаў прадбачвае пракладку шашы акурат праз гацькоўскае гарадзішча. Мо ўдасца, мо таму войтаўскаму клопату з Гацькамі будзе канец. Як у Мінску Курапатам...

Папулярная польская пагаворка кажа: Płochej baletnicy wadzi rąbek u spódnicy. Ёсць і руская пагаворка на гэтую тэму, толькі яе красамоўнасць можа выклікаць асацыяцыю з прыведзеным ватыканскім рытуалам; не прыводжу яе, каб нашы чыны не абвінавацілі мяне ў празелітызме.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

ЗА ШТО НАС ПАКАРАЛІ?

Фота архіў „Нівы”

Не паспела „Ніва” апраўдацца ад закідаў Найвышэйшай кантрольнай палаты ў справе фінансавай дысцыпліны, як такі закід быў прад'яўлены Галоўнаму праўленню БГКТ. У выніку за гэтае „злачынства” БГКТ спасціглі не такія зусім благія паслядоўнасці. Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі адказалася на тры гады даваць Таварыству фінансавую падтрымку на культурную дзейнасць. А што гэта абазначае на практыцы не трэба нікому тлумачыць. Не будзе беларускіх фэстаў у гмінных цэнтрах, не будзе таксама раённых аглядаў „Беларускай песні”, аб чым я даведаўся з тэлеперадачы Юрыя Каліны „Беларускі тыдзень” ад 4 лютага. Праўда, канцэрт „Беларуская песня' - 2007” адбыўся ў Беластоку 10 лютага, але мерапрыемства абмежавалася як да „абрэзанага” рэпертуару (адзін удзельнік, адна песня), так і да колькасці ўдзельнікаў. Як гаварыў старшыня Ян Сычэўскі, на ўзнагароды для лаўрэатаў таксама не хапае грошай. Нягледзячы на тое, героі перадачы — калектыў „Рэчанька” з Козлікаў рашыў паехаць на канцэрт беларускай песні. Лічу, што і іншыя калектывы пойдуць следам Козлікаў. Але не ў гэтым, даражэнькія, справа. Праблема ў тым, што беларусы Падляшша — з Бельскага, Гайнаўскага ды Сямятыцкага паветаў пазбаўлены будуць культурных мерапрыемстваў, якімі дагэтуль карысталіся. Пытаю затым міністэрскіх чыноўнікаў: за што вы нас пакаралі? Ці за гэта, што з'яўляемся грамадзянамі Польшчы і, таксама як палякі, плацім належныя падаткі, а гэтым самым кладзем цаглінку ў пабудову Рэчы Паспалітай? А мо з'яўляемся прышэльцамі з іншай планеты, якія павінны ізаляваца ў сучаснай рэчаіснасці? Прыналежнасць польскай дзяржавы да шматнацыянальнай еўрасаюзнай сям'і, па-мойму, дае нам гарантыю і права на карыстанне спадчынай, культурай і традыцыяй нашых продкаў. А мерапрыемствы арганізаваныя Галоўным праўленнем БГКТ да такога жанру належаць.

Уладзімір СІДАРУК

Вялікі жаль

Праходзячы каля будынка гарадской управы, я ўбачыла заяву, што раённы агляд Фестывалю беларускай песні не адбудзецца. Я адчувала сябе так, быццам мяне нехта каменем ударыў у галаву. Чаму на наш беларускі фестываль няма грошай? Ці ж беларусы ў IV Рэчы Паспалітай нічога нявартыя?

У нядзелю 4 лютага я глядзела беларускую тэлеперадачу і слухала, што гаварылі на гэтую тэму Ян Сычэўскі і жанчыны з хору ў Козліках, а менавіта незабыўная Люба Гаўрылюк, яе дачка Ала Каменская і іх сяброўкі.

Сумны гэты фестываль. Будзе толькі цэнтральны агляд, без узнагарод і без гала-канцэрта.

Гэта пагроза не толькі беларускай песні, але і ўсяму беларускаму.

Хто ведае? Можа на другі год не будзе грошай нават і на такі сціплы фестываль беларускай песні. Можа быць яшчэ горш, калі па ўсіх школах не будуць плаціць настаўнікам за навучанне беларускай мовы? Могуць не даць грошай і на нашую **беларускую газету „Ніву”.**

У такіх умовах адбудзецца поўны заняпад беларускасці. Гэта свядомая паланізацыя.

Як нам, беларусам, абараніцца перад гэтым?

Думаю, што трэба папрабаваць шчасця ў латарэі. Можа нам пашанцуе, як сялянам з беднай італьянскай вёскі. Трэба, каб кожны працуючы беларус даў у галоўную сядзібу БГКТ хаця 5 злотых на білет „вялікага лётка”. Калі б трапілася шасцёрка, то за гэтыя грошы можна было б зрабіць нешта для беларускай грамадскасці ў Польшчы.

Трэба папрабаваць. Іншага шансу я не бачу.

Таполя

9 ☞ працяг

Пятро Ластаўка

лацце каля Белай-Падляшскай. У пасляваенны перыяд пасяліўся ў Мілянуўку пад Варшавай.

Дванаццаць гадоў (1956-1968) знаходзіліся мы з Пятром Ластаўкай у шчырым сяброўстве, займаліся заснаваннем, а потым планаваннем штодзённай дзейнасці Варшаўскага аддзела БГКТ. Даўжэйшы час былі мы членамі яго праўлення, а потым сталі членамі Галоўнага праўлення і Прэзідыума ГП БГКТ. Калі пры Варшаўскім аддзеле БГКТ арганізаваўся хор, Пятро Ластаўка знайшоў яму дырыжора — Мікалая Ждановіча. Швейная майстэрня, якою ў той час кіраваў Пятро Ластаўка, пашыла харыстам прыгожыя беларускія народныя касцюмы, вышываныя ўручную сукенкі і мужчынскія кашулі.

Пятро Ластаўка быў вялікім кнігалюбам. Меў ён у сваёй хатняй бібліятэцы многа літаратурных бібліяфільскіх рарытэтаў. Яго кнігазбор быў упарадкаваны як у сапраўднай бібліятэцы. Усе кніжкі былі пануманаваныя і занесеныя ў каталог. Пятро Ластаўка дасканала ведаў, у якім месцы на паліцах у зашклёных шафах знаходзіцца канкрэтная кніжка і імгненна яе даставаў.


Імяніны ў Мілянуўку — 29 чэрвеня 1957 года. Стаіць Пятро Ластаўка, побач сядзяць Ніна Гайлевіч і Віктар Швед — дзеячы Варшаўскага аддзела БГКТ

Пятро Ластаўка быў вясёлым і надта гасцінным чалавекам. Помню, што на яго імяніны ў 1957 годзе за даўжэзным сталом у абшырнай кватэры ў Мілянуўку сабралася больш за сотню гасцей.

Пятро Ластаўка займаўся таксама публіцыстычнай і літаратурнай дзейнасцю, апублікаваў у „Ніве” некалькі сваіх апавяданняў. Таму 8 чэрвеня 1958 года прымаў ён удзел у арганізацыйным сходзе і распрацоўцы статута Беларускага літаратурнага аб'яднання ў Беластоку.

У гэтым жа годзе Пятро Ластаўка стаў дырэктарам Прамыслова-гаспадарчага прадпрыемства „Бэтэска” (мела яно сядзібу па вуліцы Шваляжэраў 1 у Варшаве), у якім у 1960 годзе працавала ўжо сто чалавек і якое атрымала прыбытак велічынёю ў 560 тысяч злотых. Задаволены Ластаўка сцвердзіў тады, што неўзабаве „Бэтэска” выпрацуе такія фінансавыя сродкі, якія дазволяць БГКТ адмовіцца ад дзяржаўнай датацыі. Нягледзячы на вялікія дасягненні прадпрыемства, дзяржаўныя ўлады ў 1963 годзе аддзялілі „Бэтэску” ад БГКТ, а Ластаўку адхілілі ад пасады (фірма „Бэтэска” працягвае існаваць у Беластоку да сённяшняга дня).

У сваёй працы Пятро Ластаўка праявіў надзвычайныя менеджэрскія здольнасці. На жаль, быў ён ужо ў той час надта хворы. 19 верасня 1968 года інфаркт спыніў працу яго сэрца. На 61 годзе жыцця адышоў ад нас назаўсёды адзін з найбольш актыўных беларускіх змагароў за незалежнасць сваёй айчыны Беларусі.

Віктар ШВЕД

Фота з архіва аўтара

Да беларусаў!

Дарагія браты-беларусы:
Нам трэба тое знаці,
Што нашу родную „Ніву”
Кожны тыдзень трэба
чытаці!

Не толькі раз у год,
Каб каляндар набыць,
Каб ведаць калі святы
І ў царкву схадзіць!

Бо ў нашай „Ніве”
Навіны ёсць пра нас,
Ды добрая старонка
Для дзетак у школьны час.

Бо „Ніва” праўду піша,
Дае добрыя парады,
Хто яе прачытае,
Напэўна будзе рады!

Часта з нашай „Нівай”
Нам трэба сустракацца!
Сваёй роднае мовы
Ніколі не зракацца!

І праваслаўнай верай
Трэба нам ганарыцца,
І дзе хто пасяліўся,
Пра веру не забыцца!

Кумпяк

Калісьці, бывала,
Як маці кумпяк пасоліць,
То ён праз паўгода
Ляжаў у „расолі”.

Ён і колер меў гожы,
І ў смаку быў добры,
Каштаваў яго кожны,
Бо ўсім быў даспадобы.

А цяпер як купіш
Тую шынку ў краме,
Хоць колер прыгожы,
Ды смаку не мае.

Туды розных хімікатаў
Вельмі многа пхаюць,
Каб вагу павысіць
Вады падбаўляюць.

Тэрмін для спажыцця
Два тыдні яна мае,
А рукой як сціснеш
Дык вада выцякае!

Усё мяса дарагое,
Усё цану павышаюць,
А вось сялянам на скупцы
Цану абніжаюць!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połudn. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 884 egz.

Суседскія былі

ФІЛАСОФСКІЯ РАЗВАГІ

— Даследчыкі, гэта добра, — загадкава ўсміхнуўся Валодзя, наліваючы нам па чарговым кілішку празрыстай саракасяміградуснай вадкасці вырабу 2006 года, прыгатаванай на левым беразе невялічкага безназоўнага ручая ў паўночнай частцы Налібоцкай пушчы. Тое чарадзейнае зелле заўсёды схіляе да філасофскіх развагаў. А па іранічна скрыўленай усмешцы на твары майго суразмоўцы я зразумеў, што той момант ужо надышоў. — Толькі што яны даследуюць? — працягваў Валодзя. — Ну, некаторыя, хай сабе. Тэмы выбіраюць даволі патрэбныя для чалавека і грамадства. Прыкладам, „Выкарыстанне квантавага эфекту «зваротнай сувязі» для ахалоджвання кампанент нанапамерных механічных прыладаў". Адна назва чаго варта! Ці, скажам, „Уздзеянні лінейнага паскаральніка на запуск інжэктара сінхрафазатрона ОІЯІ на 10 БэВ пры яго запуску аж да 1962 года". Я думаю, што такія тэмы прыдуманы для павелічэння аб'ёму мазгоў і глыбіні памяці. А яшчэ для паляпшэння лагапедычных здольнасцей чалавека. Бо калі ў чалавека ёсць дэфект мовы, а ён гэтыя назвы зможа выгаварыць, лічы што вылечыўся. І каб тыя назвы запомніць, трэба напружыць увесь чэрап, а не толькі складкі на ілбе.

— Пагаджаюся, — стаў падыгрываць я калегу, заінтрыгаваўшыся накірункам яго філасофскіх думак. — А што ты прапаноўваеш? Якія даследаванні, на твой погляд, зараз найбольш актуальныя?

— Як гэта якія? — з такой інтанацыяй выгукнуў Валодзя, што нават фары ў машын на аўтастаянцы, дзе мы адужаўшы першую паўлітруху ўжо адкаркоўвалі наступную, адразу ж застылі ў выразах спалоханага здзіўлення. — А што зараз найбольш актуальнае для выжывання нашай еўрапейскай цывілізацыі?

— Хіба што праблемы з пагрозай яе краху, — пастараўся я не сапсаваць кірунку яго думак, і выславіўся ў стылі нашай размовы.

— Правільна! — узрадаваўся ён маёй падтрымцы. — А што можа яе ўратаваць? Я табе здраджу сакрэт. Уратаваць нас можа толькі даследаванне культуры ўжывання гарэлкі. Ніколі не слухай тых занудаў язвеннікаў, якія сцвярджаюць, што гарэлка шкодная. Каб было так, то людзі яе не пілі б. Мы ж гомасапіенсы, ці як гэта гучыць у перакладзе, людзі разумныя. Ці сталі б разумныя ўжываць тое, што шкодзіць? Ясна што не! А калі ўжываем, значыць, яно карыснае! Лагічна? Мы ж не ядзім воўчага лыка ці белых паганак. А раз нашы прашчуры, дай Бог іх душам неба, прыдумалі гэты непаўторны напой, то пра каго яны дбалі? Пра нас! А нам, каб быць вартымі іх памяці, засталося толькі даследаваць метады і мажлівасці каарыстання гэтым цудам. Вось у Заходняй Еўропе зараз людзей адвучылі ад моцных напояў. І што сталася? Кучамі пераходзяць у іслам. А тыя не п'юць. Ім забаронена. І да чаго гэта прывяло? Не маюць занятку, то ходзяць і ўзрываюцца. Тэрарызм развялі, бо гарэлкі не ўжываюць. Ды яшчэ наркату глушаць. А нам гэта трэба? У нас свая вялікая і непаўторная культура. А гэтым ніхто не займаецца. Вось ці ты ведаеш, што наша цывілізацыя вынайшла ў алкагольным кірунку?

— Даволі шмат, — радасна падтрымаў новага кандыдата ў прафесары філасофіі я. — Рэстараны, бары, офісы, выезды на прыроду, рыбалкі, паляванні, віна-гарэлачныя крамы, піўнушкі, забягалаўкі, пад'езды, завуголлі, ванітавалаўкі...

— Так! — падхапіў падпіты мысліцель. — А яшчэ, для хранічных алкаголікаў існуюць выцвярэзнікі, кары, сямейныя скандалы, а для тых, хто хоча пазбегнуць скандалаў, прыдуманы санаторыі, камандзіроўкі, гатэлі, дзяржаўныя і канфесійныя святы... А самае лепшае, што вынайшаў чалавек, гэта платныя аўтастаянкі. Няма на свеце анічога больш прыстасаванага да псіхікі мужчыны, які хоча спакойна, у добрай сяброўскай размове перакуліць кілішак другі, чым аўтастаянка. Чалавек ужо паставіў сваю жалязяку, супакоіўся, калі трэба большая кампанія, то ўключыў аўтамагнітолу, і нікога не баіцца. У сваёй машыне, ды яшчэ ахова звонку. Ні міліцыя цябе не дастане, ні жонка прэтэнзій не выкажа. У разе чаго, тут можна і заначаваць. А хто займаецца даследаваннем гэтага феномена? Ніхто! Шкада, што я не працую ў навуковай сферы, бо пра гарэлку ведаю ўсё. І як начальніка на працы абдурыць, як перад жонкай прыкінуцца цвярозым, як выпіць у цэнтры горада, каб міліцыя не заўважыла. Напісаў бы я якую працу, ганарар атрымаў бы за свой Божы дар. У гэтай галіне роўных мне няма...

Яго развагі перабіў істэрычны гук рухавіка забуксаваўшай машыны. Адзін з суседзяў па аўтастаянцы стараўся прыпаркаваць машыну на нерасчышчаным ад снегу месцы. У яго нервовых рухах адчувалася нейкая паніка. Нарэшце машына вырвалася са снежнага палону, выраўнялася і дала задні ход. А яе гаспадар, адной рукой спраўляючыся і з рулём, і з пераключэннем перадачаў, адным вокам зазіраючы ў люстэрка заднягa віду, а другім некуды на ўезд у аўтастаянку, другой рукой дастаў бутэльку, зубамі здзёр корак і нагбом асушыў яе. А пасля рэзкім рухам шпурляну ў пустую пасудзіну некуды ў гурбу падалей ад машыны. Ён выканаў свае дзеянні так рэзка і хутка, што, здавалася, тыя рухі ў яго адпрацаваныя як у салдата ганаровага каравула Вялікабрытаніі, які на парадзе дэманструе ўменне валодаць карабінам. Падзенне бутэлькі ў гурбу і выключэнне рухавіка машыны па часе супалі хвіліна ў хвіліну. А ў наступны момант шафёр шпарка выскачыў са старэнькага „Опеля" і памаршыраваў на выхад. Ад здзіўлення вочы ў нас сталі як у істоты, народжанай ад савы скрыжаванай з лемурам. Мы, не згаворваючыся, кінуліся наўздагон, каб неяк паспрабаваць высветліць прычыны тых незвычайных паводзін. А той ужо падыходзіў да выхаду.

— Ну што, замерзлі? — спытаўся ён у дзвюх жанчын, якія чакалі на вуліцы, хаваючы ад лютаўскай завеі галовы ў шубы. І патлумачыў: — На гэтай стаянцы правілы дурныя. Не дазваляюць заязджаць з пасажырамі.

— Ой, зяцёк! — пляснула ў далоні адна. — А ты зноў выглядаеш як п'яны!

— Ну што вы, мама, — прастагнаў той. — Калі ўжо перастанеце чапляцца да мяне і дачку вашу зводзіць. Вы ж цэлы дзень са мной ездзілі. Калі я мог выпіць? Колькі вам тлумачыць, што праца ў мяне цяжкая. Таму і выглядаю як п'яны. Сёння самі пераканаліся ў гэтым. Ты хоць скажы сваёй маме, каб замаўчала, — звярнуўся ён да другой кабеты. — А то ўсё крычыць, што наша сям'я з-за гарэлкі развальваецца. А пагроза для сям'і гэта яна сама. Вечна скандалы правакуе.

— І праўда, мама, супакойся, — адгукнулася тая. — Сёння вы самі бачылі, што і ў рот не ўзяў.

І яны паціху пацягнуліся ў бок аўтобуснага прыпынку.

— Вось табе і на! — пачасаў патыліцу Валодзя. — Нават у маім вялікім досведзе прыбавілася. Я ж кажу, справа патрабуе сур'ёзнага вывучэння і даследавання. За такое можна і Нобеля атрымаць. Ну, пайшлі ў машыну. Абмяркуем гэты выпадак з філасофскага пункту гледжання. У мяне там, пад сядзеннем, яшчэ адна пляшка засталася. Паразважаем.

Віктар САЗОНАЎ

18.02 – 24.02

Баран (22.03. — 20.04.) Не гавары партнёру такога, каб пасля не шкадаваць; жыццё ў пары гэта не палігон! 21.02. будзеш мець асаблівую прыхільнасць атачэння, адкрыешся на каханне. Знакамітая фінансавая кан'юнктура!

Бык (21.04. — 21.05.) Націскі атачэння цяжка перанесці. Ды калі супрацьпаставішся — будзеш мець немалыя карысці. Некаторыя падзеі выб'юць цябе з раўнавагі (неабавязкова адмоўныя).

Блізняты (22.05. — 21.06.) Будзеш ажыўлены, поўны сілы. Дагаворышся з людзьмі, пераканаеш іх да сваіх ідэй. Некаторыя планы пагараць. 20-24.02. праблемы на працы (не ўпірайся на сваім і прымай пад увагу думкі іншых).

Рак (22.06. — 23.07.) Цяжка вырашаць. Не чакай моманту, каб падзейнічаць, бяры справы ў свае рукі і рушай у бой! Удалыя інвестыцыі і падарожжы. Прарочыя сны.

Леў (24.07. — 23.08.) Магчымыя праблемы; не запальвайся да ідэй, якія віламі пісаныя па вадзе. Не давярай асобам, якія апрача балбатання нічога не робяць.

Дзева (24.08. — 23.09.) Будзеш ажыўленая, упэўненая ў сваіх рацыях і сабе. Знакаміты час афармляць справы ва ўстановах і банках. Радасць ад радні.

Шалі (24.09. — 23.10.) Будзеце надта ж зайздросныя! Не раньце сваіх партнёраў да жывога! Гарачыя жарсці. Можаце падумаць над выбарам новай жыццёвай дарогі.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Новы этап у адносінах з блізкімі (новы дом, павелічэнне сям'і...). Асцерагайся негатыўных пачуццяў і пільнуй, каб не знішчылі яны твайго шчасця. Нечакана захопішся кімсьці або захопіш кагосьці.

Стралец (23.11. — 22.12.) Спакой у сям'і, добры час для пачуццяў. Варта сарганізаваць большую імпрэзку. Можа быць сум пасля расстання з асобамі, якім ты давяраў.

Казярог (23.12. — 20.01.) Стаўленне на ўласны развой, афармлянне ўласных інтарэсаў (некаторыя палічаць гэта самалюбствам). Згода з раднёй; ахвотна адновіш старыя знаёмствы. Варта паехаць у ціхае, спакойнае месца.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Самаўпэўненасць, ды маскіруючыя апаскі і страх перад рашэннямі, сумненні, ахвота схаваць галаву ў пясок. Мілыя знаёмствы. Варта запланаваць падарожжа.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Будзеш дыхаць на поўныя грудзі. Будзеш радасны і творчы. Паправіцца здароўе. 21-24.02. не ангажуйся ў штосьці, на чым можаш шмат страціць (не вер таму, у каго на вусных прыгожыя лозунгі).

Агата АРЛЯНСКАЯ

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 2 нумара

Чарнігаў, хамут, вона, Нептун, бетон, Ісаак, Урумчы, сарока, гарадзішча.

Рашэнне: **Хто новага не бачыў і старому рад.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Адгаданка



1. вялікая металічная пасудзіна круглай формы або поўнае акружэнне воінскай групоўкі, 2. лёгкаатлетычны снарад у форме круга, 3. установа, якая збірае помнікі матэрыяльнай і духовай культуры для зберажэння і агляду, 4. у гіпертаніі ён высокі, 5. сібірская рака ў Краснаярску, 6. Іаган Себасцьян, нямецкі кампазітар (1685-1750), 7. грашовае выражэнне вартасці тавару, 8. сыпкія часцінкі кварцу, 9. апрацаванае пад сяўбу поле, 10. жыхар Берліна, 11. Анатоль, беларускі паэт (1959-2005), 12. усходняя страва, прыгатаваная з бараніны і рысу, 13. грашовая літоўская адзінка, 14. Сяргей, былы футбаліст беларускай зборнай і турынскага „Ювентуса", 15. часовая ізаляцыя заразных хворых, 16. медыкамент.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Рамона Гомеса дэ ла Серны.

(ш)

ISSN 0546-1960